I-б. "Савецкая Беларусь"
Москва, Моховая, 3 Публичной библиотеке СССР им. Ленина
студ. оньек. адзін экз.

Саветы ідуць — ...ытворчасьці і калгаснага будаўніцтва!

УЦЯГНЕМ МІЛЬЕНЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ У КІРАЎНІЦТВА ДЗЯРЖАВАЙ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР
5 лістапада 1931 г.
№ 257 (3346)



М. Гнілякевіч

БССР да 14-й гадавіны

Кастрычнікавай рэвалюцыі

Рабочая кляса БССР прыходзіць да сьвята Кастрычніка з вялікімі перамогамі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Сьвяткаваньне 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў БССР адзначаецца нічуваным гаспадарчым будаўніцтвам, культурным уздымам нашай рэспублікі, пасьпяховым выкананьнем пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі ў 4 гады.

Тыя даасягненьні, якія мае Беларуская ССР ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, ня могуць ісьці ні ў якае параўнаньне з мінулым. Нават, калі параўнаць сучасное становішча БССР з тым становішчам, у якім Беларуская ССР была 2—3 гады назад, то і гэтае параўнаньне дае магчымасьць адзначыць вялізарныя тэмпы будаўніцтва, такія тэмпы, якіх ня ведае і ня ведала ні адна буржуазная краіна. Тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР нават перавышаюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў іншых саюзных рэспубліках. Тут досыць прывесьці кароткія весткі аб індустрыялізацыі савецкіх рэспублік. Так, сярэдні процант прыросту рэспубліканскай прамысловасьці за адзін толькі 1930 год складаў па БССР 67,5 проц., у той час, калі агульна-саюзны рост рэспубліканскай прамысловасьці раўняецца 32,1 проц. За пяцігодку асноўныя фонды прамысловасьці па БССР павінны ўзрасьці на 442 проц. у той час, калі па ўсім Саюзе ССР яны ўзрастаюць на 289 проц., па УССР на 308 проц., і г. д. Гэты факт лепш за ўсё сьведчыць аб супнасьці палітыкі партыі ў адносінах да тых нацыянальнасьцей, якія раней ня мелі права на сваё існаваньне.

Чым тлумачыцца посьпехі дасягнутыя ня толькі ў БССР, але і ў іншых, раней адсталых, рэспубліках? Яны тлумачацца правільным вырашэньнем нацыянальнага пытаньня.

Буйны расквіт савецкіх рэспублік, які зьяўляецца вынікам правільнай генеральнай лініі нашай партыі, правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, зьяўляецца ня толькі справай умацаваньня краіны саветаў, але і справай пасьпяховай барацьбы за сусьветны Кастрычнік.

Дзесяць год назад Ленін сказаў:

«Зараз галоўнае свае ўзьдзейнічаньне на міжнародную рэвалюцыю мы робім сваёй гаспадарчай палітыкай. Усе на Савецкую Расійскую рэспубліку глядзяць, усе працоўныя ва ўсіх краёх сьвету без выключэньня, без усялякага перавялічэньня... На гэтай арэне змаганьне перанесена ва ўсясьветным маштабе. Вырашым гэтую задачу — і тады мы выйграем у міжнародным маштабе напэўна і канчаткова. Таму пытаньне гаспадарчага будаўніцтва набывае для нас значэньне зусім выключнае...»

БССР як і іншыя савецкія рэспублікі як і ўвесь Саюз ССР у цэлым паставілі перад сабой задачу ў найкарацейшы гістарычны тэрмін ня толькі дагнаць, але і перагнаць буржуазныя краіны, як у эканамічных, так і ў тэхнічных адносінах. Да вайны на тэрыторыі БССР было ўсяго 20.000 рабочых, а да 1925 году лік рабочых павялічыўся да 21.500 чалавек. Зараз, калі ўзяць рабочых цэхавай прамысловасьці, а таксама будаўнікоў і чыгуначных рабочых, дык мы ўжо маем 150.000 рабочых. Замест дробнай саматужнай прамысловасьці, адсталых незначных прадпрыемстваў вырасьлі новыя прадпрыемствы, узброеныя па апошнім слове тэхнікі. За апошні час савецкай уладай у БССР створаны зусім новыя галіны прамысловасьці: машынабудаўнічая, апрацоўчая, хімічная, тарфяная і інш.

Нячуваныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць значнай колькасьці рабочых рук. Гэта дало магчымасьць цалкам ліквідаваць беспрацоўе ня толькі ў БССР, але і ў іншых савецкіх рэспубліках. Разьвіцьцё індустрыі патрабуе падвядзеньня пад ня новай вышэйшай тэхнічнай базы. Калі выраб электраэнэргіі ў 1914 годзе складаў 12 мілл. квт.-гадзін, то зараз ён складае 80 млн. квт.-гадзін. Рост асноўных капіталаў у рэспубліканскай прамысловасьці 5 год назад складаў усяго 30 млн. руб., пры гадзе назад — 70 млн. руб., а ў кастрычніку 1930 г. звыш 140 млн. руб. Валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ў 1926-27 г. складала ўся го каля 130 млн. руб., у 1929-30 г.— 395 млн., а ў 1931 г. разьмер валавой прадукцыі яшчэ больш павялічваецца. За 9 месяцаў 1931 г. прадукцыя на вырабу сельска-гаспадарчых машын на прадпрыемствах ВСНГ БССР роўна ў 2 разы перавышае прадукцыю за 9 месяцаў 1930 году (замест 4,2 млн. руб.—8,4 млн. руб.).

Такім чынам, прамысловасьць Беларускай ССР становіцца вядучай галінай усёй народнай гаспадаркі і ў 1931 годзе яна перавышае ў БССР па сваёй валавой прадукцыі прадукцыю сельскай гаспадаркі. У той час, калі ў 1926-27 г. выраб прамысловай прадукцыі складаў 24,4 проц., у гэтым годзе складае 53,2 проц. усёй прадукцыі. Рост прамысловасьці адбываецца побач з вялічэзным ростам сельскай гаспадаркі ператварэньнем і перабудовай яе на новых сацыялістычных падставах. Ужо да гэтага часу ў БССР калектывізавана звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Такім чынам, тое заданьне, якое даў апошні X Усебеларускі зьезд Саветаў Ураду БССР калектывізаваць да восені гэтага году 45 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак — выканана і перавыкананы.

Дробная распыленая сельская гаспадарка з вельмі дрэннай тэхнічнай базай, з вельмі нізкім культурным і матар'яльным узроўнем жыцьця апромінутай большасьці сялян ператвараецца ў буйную сацыялістычную гаспадарку. Ужо ў сучасны момант на полях БССР гудуць 1823 трактары і існуюць 31 машына-трактарных станцый з агульнай колькасьцю трактароў 1018. Агульны лік конскіх сіл усіх трактароў складае 20.053. Пасеўная плошча БССР за гэтыя 14 год значна ўзрасла, і ў сучасны момант складае 3.974.000 га, прычым пад саўгасамі знаходзіцца 109.000 га, пад калгасамі —1.032.200; Значна ўзрастаюць пасевы тэхнічных культур і ўжо ў гэтым годзе пад пасевамі лёну і канапель было занята 280.400 га.

Аднэй з асноўных задач у разьвіцьці сельскай гаспадаркі БССР зьяўляецца жывёлагадоўля і асабліва сьвінагадоўля. Гэтая праблема пасьпяхова вырашаецца сацыялістычным сэктарам сельскай гаспадаркі. Ва ўсіх саўгасах ў сучасны момант ёсьць 13.279 коняй, 53.778 буйнай рагатай жывёлы, 76.281 сьвіней. Ёсьць 1.559 сьвінагадоўчых таварна - калгасных фэрм, у якіх маецца 67.617 сьвінаматак. Прадукцыя, якую даюць гэтыя сьвінагадоўчыя фэрмы раўняецца 9.179 цэнтн. Ёсьць 1.018 малочна-таварных фэрм з агульнай колькасьцю кароў у іх 71.878. Гэтыя фэрмы здаюць малака —210.361 цэнтн. Пры разьвіцьці жывёлагадоўлі завернута выключная ўвага на падвышэньне прадукцыйнай жывёлагадоўлі шляхам арганізацыі мэтызаціі з найбольш [illegible]окімі прадукцыйнымі пародамі буйнай рагатай жывёлы і сьвіней.

Рэканструкцыя ў 1931 г. сельскай гаспадаркі забясьпечвае выкананьне пяцігодкі па асноўным рашаючым галінам нават ня ў 4, а ў 3 гады. Трэбатакім чынам лічыць, што пяцігадовае разьвіцьцё сельскай гаспадаркі ў асноўным павінна быць скончана ў тры гады.

Вялікія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва паставілі перад БССР са ўсёй вастратой пытаньне шпаркага разьвіцьця навукі і тэхнікі, падрыхтоўкі кадраў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі і стварэньня сваёй уласнай пралетарскай навуковай і вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі.

Яшчэ XV Зьезд УсесКП(б) па пытаньнях культурнага будаўніцтва нацменшасьцей вызначыў, што «пяцігадовы план павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу пытаньням уздыму эканомікі і культуры адсталых раёнаў, выходячы з неабходнасьці пасьпяховай ліквідацыі і эканамічнай, і культурнай адсталасьці, адпаведна прадугледжваючы больш шпаркі тэмп разьвіцьця эканомікі і культуры».

Выконваючы гэтую дырэктыву ў БССР выключная ўвага зьвернута на культурнае будаўніцтва. У БССР у вышэйшых навучальных установах навучаецца — 5.334 студэнтаў, ёсьць 20 рабфакаў, 4 рабочых унівэрсытэты, 61 тэхнікум, 75 прафшкол, 45 фабзавучаў, шмат курсаў для дарослых і падлеткаў і г. д. Усе школы БССР— 4-х годкі, сямігодкі, дзевяцігодкі, якіх маецца 6661, навучаюць 672.574 вучня. Калі гэтыя школы разьбіць па нацыянальнай адзнацы, то мы атрымаем: 5.969 беларускіх школ, 222 яўрэйскіх, 147 польскіх, 85 расійскіх, 18 латыскіх, 11 украінскіх, 6 літоўскіх, 3 нямецкіх, 1 эстонская і г. д. БССР зараз пасьпяхова ліквідуе няпісьменнасьць сярод дарослага насельніцтва ва ўзросьце да 45 год. Гэтая ліквідацыя павінна быць цалкам скончана ў 1932 г.

У той час, як у капіталістычных краінах нагнятаецца пячуваны шалтоўны нацыянальны ўціск, у СССР мы маем вялікі ўздым культурнага будаўніцтва ўсіх нацменшасьцей. БССР пасьпяхова будуе сваю пралетарскую культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу.

Правільнае правядзеньне ў БССР ленінскай нацыянальнай палітыкі забясьпечыла вялізарныя посьпехі ў галіне эканамічнага і культурнага ўздыму БССР. Тут мы можам падаць некаторыя лічбы ўмацненьня нацменшасьцей у сацыялістычнае будаўніцтва БССР. Толькі за апошні год у прамысловасьці БССР лік рабочых яўрэяў павялічыўся на 70 проц., палякаў на 50,2 проц., расійцаў на 45,6 проц., латышоў, літоўцаў, немцаў і татар на 51 проц.

Польскае працоўнае сялянства ахоплена калектывізацыяй на 60 проц. Ёсьць некаторыя нацыянальныя польскія саветы, як Лодзінскі, Аляксандраўскі, Хрыпялеўскі і інш., якія калектывізаваны на 100 проц. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі латыскага насельніцтва калектывізаваны на 70 проц. Некаторыя латыскія сельсаветы зьяўляюцца саветамі суцэльнай калектывізацыі. Гаспадаркі татарскага працоўнага сялянства калектывізаваны звыш чым на 60 проц. і г. д.

БССР у асноўным ужо вырашыла адно з важнейшых пытаньняў — пытаньняў упарадкаваньня мястэчак і ўцягненьня ў вытворча - грамадзкую працу яўрэйскай местачковай беднаты. Лік сямей працоўнага яўрэйскага насельніцтва, абладнаных у калгасы толькі за апошнія 1½ гады ўзрос больш чым ў 2 разы. Толькі за 1931 г. да 3.000 сямей яўрэйскай беднаты упарадкавана па лініі саматужна-прамысловай кааперацыі. Ёсьць нацыянальныя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва адчынены ліквпункты на нацмовах. У мэтах больш пасьпяховага разьвіцьця сацыялістычнай культуры нацменшасьцей і шпаркага разгортваньня навукова-дасьледчай работы пры БАН створаны нацыянальныя сэктары—яўрэйскі, польскі, латыскі і літоўскі.

Для забесьпячэньня абслугоўваньня працоўных нацменшасьцей на іх родных мовах у мясцох з кампактнай масай насельніцтва паасобных нацменшасьцей—створаны нацыянальныя саветы, якіх у сучасны момант ёсьць ужо 77. У БССР выдаецца 7 нацыянальных газэт і часопісаў на мовах—яўрэйскай, польскай і літоўскай.

Усе гэтыя мерапрыемствы значна садзейнічаюць шпаркаму ўзьнікненьню эканамічнага і культурнага ўзроўню нацменшасьцей БССР.

Кастрычніцкая рэвалюцыя цалкам ліквідавала беспрацоўнае становішча жанчын. У сучасны момант ужываюцца ўсе крокі да найбольш поўнага ўцягненьня жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва. Зараз мы маем у складзе гарадзкіх саветаў БССР 1.293 жанчыны, з іх у прэзыдыумы гарсаветаў уваходзіць 58 жанчын і 4 жанчыны працуюць у якасьці старшынь гарсаветаў. Ва ўсе сельсаветы ў выбіку апошніх перавыбараў абрана 10.920 жанчын, з іх у прэзыдыумах сельсаветаў працуе 1.368 і старшынямі сельсаветаў— 78 жанчын. У складзе раённых выканаўчых камітэтаў ёсьць 614 жанчын, з іх у прэзыдыумах райвыканкомаў працуюць 102 жанчыны і 1 жанчына працуе ў якасьці старшыні райвыканкому. У складзе Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту апошняга скліканьня знаходзіцца 46 жанчын, з іх 1 жанчына ўваходзіць у прэзыдыум ЦВК БССР.

Ліквідацыя акруг значна ўзмацніла матар'яльную базу раённых выканаўчых камітэтаў. Зараз усе сельсаветы маюць самастойныя бюджэты. Раёны значна ўзмацнены былымі акруговымі працаўнікамі. Менск, Гомель і Віцебск вылучаны ў самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзіны, якія непасрэдна падпарадкаваны прэзыдыуму ЦВК БССР.

Работа саветаў і выканаўчых камітэтаў БССР перабудоўваецца ў напрамку большага ўцягненьня шырэйшых працоўных мас у актыўную работу са всякага будаўніцтва. Разгортваюцца сацыялістычныя мэтады працы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваецца работа сэкцый і камісій пры саветах і выканаўчых камітэтах. Саветы пасьпяхова мабілізуюць творчую ініцыятыву і актыўнасьць рабочых і калгасных мас на барацьбу за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, за арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за рашучы наступ на капіталістычныя элементы па ўсім фронце і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі. У апошні час у БССР пасьпяхова ажыцьцяўляецца лёзунг аб паваротце саветаў тварам да вытворчасьці саўгаснага і калгаснага будаўніцтва.

Паказчыкі гаспадарчага і культурнага росту Беларускай ССР гавораць аб тым, што БССР з посьпехам перамагае цяжкасьці росту, змагаецца за большавіцкія тэмпы разьвіцьця народнай гаспадаркі краіны ўпэўнена ідзе да сацыялізму.

У выніку правільнай палітыкі партыі і савецкай улады ўсё больш узмацняецца на базе вытворчай змычкі горату і вёскі саюз рабочае клясы і асноўных мас сялянства. БССР знаходзіцца на правільным шляху пабудовы сацыялізму і тыя кароткія прыведзеныя тут паказчыкі посьпехаў сьведчаць аб тым, што перамога на гэтым фронце цалкам забясьпечана.

БССР да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі прыходзіць з апромінутымі посьпехамі. Гэтыя-ж посьпехі зьяўляюцца залогам таго, што бліжэйшыя гады дадуць яшчэ большыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і што пабудова сацыялізму ў БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі цалкам забясьпечана.

Сакратар ЦВК БССР тав. Гнілякевіч сярод дэлегатаў міжраённай нарады сельсаветаў раённу суцэльнай калектывізацыі.

Сельсаветы раёнаў суцэльнай калектывізацыі за стварэньне „Чырвонай кнігі саветаў"

Нарада сельсаветаў Лепельскага, Койданаўскага, Клімавіцкага, Амсьціслаўскага раёнаў суцэльнай калектывізацыі ў адказ на зварот Мазырскай міжраённай нарады [illegible]ёлагадоўчых раёнаў уключаецца ў сацыялістычнае спаборніцтва за стварэньне «Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартоў саветаў» і за месца ў ёй.

Нарада прымае праграму-мінімум, высунутую газэтай «Савецкая Беларусь» з дадаткамі, зробленымі нарадай прымежных раёнаў, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, як на галоўную задачу.

Арганізацыя цягавай сілы зьяўляецца адным з галоўных фактараў--арганізацыі гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў.

Таму нарада бярэ на сябе абавязкі ўсямерна праводзіць у жыцьцё ўсё мерапрыемствы, прадугледжаныя пастановай СНКБ ад 13 кастрычніка аб коняагадоўлі.

Нарада зьвяртаецца да ўсіх астатніх раёнаў БССР з выклікам неадклад на ўключыцца ў сацспаборніцтва. Запэўніваем ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР, што ўзятыя на сябе абавязацельствы выканаем.

Прэзыдыум нарады.

За ўдарную работу на фінансавым фронце—ганаровае м сца ў „Чырвонай кнізе"

Газэтай «Савецкая Беларусь» высунута пытаньне аб арганізацыі «Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартаў саветаў». Гэты пачын «Савецкай Беларусі» ухвален ЦВК БССР.

Фінансавы фронт у сучасны момант—важнейшы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва. Райвыканкомы, Сельсавіты і Гарадзкія Саветы! Ударнай работай па выкананьні фінансавага пляну заваёўвайце ганаровае месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартаў саветаў».

Народным Камісарыятам Фінансаў устаноўлен прэм'яльны фонд у 2000 рублёў для прэм'яваньня тых Райвыканкомаў, сельскіх і гарадзкіх саветаў, якія поўнасьцю і своечасова выканаюць па ўсіх пунктах пляны мабілізацыі сродкаў IV кварталу і разам з гэтым пакажуць лепшыя прыклады масавай работы і 3000 рублёў для прэм'яваньня фінансавых сэкцый, дэпутацкіх груп і паасобных ударнікаў, праявіўшых ударную работу па выкананьні фінансавага пляну.

Народны Камісар Фінансаў БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Работніца т. Нахамава, кіраўнік дэпутацкай групы заводу «Бальшавік».

Выпіска з пратаколу № 19, п. 2 паседжаньня

Сакратарыяту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ад 1-га лістапада 1931 г.

СЛУХАЛІ	ПАСТАНАВІЛІ:
2. Пра стварэньне фонду па прэм'яваньні саветаў, якія будуць уключаны ў „Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў". (Ун. Аргінстрам Прэзыд. ЦВК БССР).	2) 1. Ухваліць ініцыяты у газэты „Савецкая Беларусь" у справе арганізацыі „Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартоў саветаў", у якую будуць унесены саветы добра закончуўшыя трэці рашаючы год пяцігодкі па ўсіх пакажніках і перабудаваўшых сваю работу ў адпаведнасьці з сучаснымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Згадзіцца з праграмай-мінімумам, выпрацаван й рэдакцыяй газэты „СБ", выканаць якой павінна легчы ў аснову ўключэньня таго ці іншага савету ў кнігу. 2. Лічыць неабходным шырока прэм'яваць саветы і паасобных работнікаў, якія выканалі праграму-мінімум і гэтым самым дабіліся права быць занесенымі у „Чырвоную кнігу саветаў". З гэтаю мэтаю стварыць фонд „Чырвонай кнігі" пры прэзыдыуме ЦВК. 3. Унесьці ў сьнежні гэтага году на паседжаньні прэзыдыуму ЦВК даклад рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" пра ход сацспаборніцтва і арганізацыю выпуску „Чырвонай кнігі".

Сакратар ЦВК БССР [signature]

Дэпутацкая група чырвонасьцяжнага „Бальшавіка" ўступіла ў сацспаборніцтва

Дэпутацкая група чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» уключаецца ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартаў саветаў».

Мы абавязуемся выканаць усе пункты для дэпутацкіх груп, паказаныя ў праграме-мінімуме па ўключэньні гарадзкіх і сельскіх саветаў у сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе» (зьмешчаная ў газ. «Сав. Бел»., № 244).

Выклікаем на сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў» дэпутацкую групу машына-будаўнічага заводу імя ВАРАШЫЛАВА.

Кіраўнік дэпутацкай групы зав. «Бальшавік» НАХАМАВА.

Рулявыя

Перад тым, як пачаць аповесьць аб дэпутацкай групе заводу «БАЛЬШАВІК» хочацца ўспомніць невялікі эпізод.

Два качагары, стугаль, сартоўшчыца, вакум-апаратчык і абрэзчыца былі пасланы тысячным калектывам «Бальшавіка» у гарсавет дэпутатамі. Калі на выбарчым сходзе чыталі доўгі наказ, нехта з задніх лавак крануў нанова абранага дэпутата за плячо і ціха сказаў:

— Чытаюць амаль паўгадзіны, а за колькі, таварыш дэпутат, гэта выканаеш?

— Без цябе і за 3 гады ня выканаю. Той хто пытаўся рашыў, што дэпутат абразіўся, а дэпутат думаў гэта зусім сурёзна.

Фактычна ў гэтым адказе вялікая праўда. Два качагары, стугаль, зольшчык, сартоўшчыца, вакум-апаратчык і абрэзчыца толькі людзі пастаўленыя да руля і без актыўнай дапамогі ўсяго калектыву яны бяссільны...

А цяпер расскажам аб справах дэпутацкай групы.

Калі першая зьмена скончыла работу, калі ля рукамыйнікаў стварылася чарга, у сталоўцы хромавага цэху, дзе прызначаны сход дэпутацкай групы была адна НАХАМАВА — абрэзчыца першага хромавага — кіраўнік дэпутацкай групы. Яна перасоўвала цяжкія лаўкі, паглядала на гадзіньнік і калі ў сталовую ўвайшоў ШАПАШНІК, старшыня камс[illegible] толькі спытала.

— Абвесьціў у шэрсцямыйцы?

— Зрабіў, — адказаў Шапашнік.

Нахамава працягвала работу, ператвараючы сталоўку ў залю паседжаньняў. Шапашнік хадзіў за Нахамавай падсоўваў ёй кніжачку студэнта вячэрняга Камвузу і бубнёў:

— Маё пытаньне першым... Мне ў Камвуз.

— У Камвузе пачатак а 7-й гадзіне, а зараз 4, пасьпееш, дапамажы лепш лаўкі цягаць...

Просьба Шапашніка была задаволена. Шапашнік стаяў перад дэпутацкай групай і рабіў справаздачу аб фінэстафэце. Ён гаварыў:

— На заводзе 900 рабочых. Усе ўкладчыкі касы ашчаднасьці. Адліў сродкаў за 3 квартал ліквідавалі. На 4-ы квартал заданьне 4.000 і па самастрахаваньні 1.000. За пяцёўны месяц 4-га квартału далі 3.290 па ўкладах і 1.648 руб. па самастрахаваньні. Плян значыцца, перавыкананы..

7 дэпутатаў Гарсавету, 38 добраахвотнікаў прымацаваныя да сэкцый гарсавету, 24 нарзсоядацялі, сацсумячальнікі, прымацаваныя ад завкому, ячэйкі, адміністрацыі проста ўдарнікі —цікавяцца работай дэпутацкай групы. абгаворвалі дакляд таг. Шапашніка.

Было ўстаноўлена, што, ня гледзячы на дасягненьні, усё-ж адстае жалятынны цэх, што ня ўсе новыя рабочыя ахоплены пазыкай, што для гэтага неабходна, вылучыць людзей з дэпутацкай групы, каб выправіць гэты прабел.

Затым чыталі ліст з ВІЦЕБСКУ.

— Ня гледзячы на шматразовыя зваротны адміністрацыі да заводу «Бальшавік» — піша дэпутацкая група Віцебскай гарбарні імя Лекерта— аб тым, каб нам прысылалі хром правільнага футажу, мы на сёньняшні дзень гэтага не дабіліся...

Ліст, які зараз зачытваўся, абвінавачваў завод «Бальшавік» ў тым, што ён не дадае футажу. Абвінавачвалі такім чынам у ашуканстве. Дэпутацкая група слухала ўважліва. Была ці шыня. І ў гэтай цішыні была напружанасьць, як гэта бывае на судзе калі слухаеш абвінавачае заключэньне. Тым больш, што ў наступным абзацы гаварылася так:

— З-за гэтага мы трацім у перакроі па 2.000 руб. у месяц, таму мы ня выконваем прамфінпляну...

— Значыцца мы жулікі? значыцца ў нас крымінальшчына—абурана крычаў загадчык вытворчай часткі заводу

— Пачакай — перабівае старшыня —няхай скажа загадчык цэху.

Загадчык цэху расклаў перад сабой кіпу папер, насунуў акуляры і даказаў. Ён даказаў, што футамеры і шаблёны да іх праверены ў палаце мер і вагі, што футаж двойчы правярала брыгада па гатовай прадукцыі, нарэшце, што ад фабрыкі Лекерт сядзеў тут спэцыяліст, які за 2 з паловай месяцы не знайшоў ніводнай памылкі і нарэшце сказаў: «мне тут няма чаго рабіць, усё правільна». І самае галоўнае:

— Чырвонаштандарны «Бальшавік» не займаецца ашуканствам.

— Ясная справа, чаго тут муру раз водзіць? Лекертаўцы ня выконваюць прамфінпляну, дык вось табе «аб'ектыўка» — футаж няправільны. Гэта мякка гаворачы мана. Так і адказкам дэпутацкай групе, хай і яна ведае— гэта адпіска на прарывы.

Так гаварылі на сходзе.

У такім духу і парашылі адказаць.

За плячыма дэпутацкай групы «Бальшавіка» вопыт 6 месяцаў работы. З кожным днём група заваёўвае сваёй практычнай работай вядомае месца на заводзе, робіцца сапраўды пяршачнай ячэйкай савецкай улады на прадпрыемстве.

У самой рабоце савецкай групы, сістэма работы зьмянялася ў залежнасьці ад таго, як група абагачваецца вопытам

БЫЛО РАНЕЙ ТАК.

Аб выкананьні прамфінпляну па цэхах дакладваў загадчык цэхам. Спрэчкі па дакладзе ператвараліся ў формены допыт, аб стансвішчы ў цэху. І толькі потым дэпутацкая група выносіла свае рашэньні: дапамагчы, пра верыць...

ЦЯПЕР ІНАКШ.

За выкананьне прамфінпляну ў цэху адказвае кожны член дэпутацкай групы. Дэпутат гарсавету дакладвае на дэпутацкай групе аб тым, што зроблена ДЭПУТАТАМ для ўзмацненьня барацьбы за прамфінплян.

Нядаўна была праведзена праверка сацыялістычных умоў у тых цэхах, дзе працуюць члены дэпутацкай групы. Ад дэпутатаў патрабавалі больш шага, да дэпутатаў прадъявілі вышэйшыя патрабаваньні.

Калі мы гаворым аб дэпутацкай групе на «Бальшавіку» нельга не сказаць аб тым, як чырвонаштандарцы змагаюцца за выкананьне вытворчых заданьняў, бо частка і большая частка віны ці заслугі прыпадае на яе, на дэпутацкую групу.

Рабочыя гарбары вялі барацьбу супроць царызму, супроць польскіх і нямецкіх акупантаў. У гісторыі заводу ёсьць факты гераічнай абароны яго са зброяй у руках. Рабочыя змагаліся за вахаваньне заводу для савецкай улады, гатовыя абараняць яго цаною свайго жыцьця. Усім памятны байкоты, скарочаньні, забастоўкі пры акупантах, работа нацыяналістычнай арганізацыі польскай аховы «Стаўшца», забастоўка пры нёмцах, прыход заводчыкаў і выступленьне іх супроць рабочых са зброяй.

Рэвалюцыйныя традыцыі не забываюцца, не прападаюць дарма.

Завод «Бальшавік» пераможна ідзе ва ўсіх трох гадох пяцігодкі з вялікім перавыкананьнем прамфінпляну.

Калі па пяцігодцы валавая прадукцыя за 1928-29 г. складала 6.495.000 р., дык фактычна завод выканаў у гэтым-жа годзе праграму ў 7.576.000. У другім годзе пяцігодкі праграма складала 7.549.000, а фактычна выканана па 8.157.000, у трэцім годзе пяцігодкі з 1-га кастрычніка 1930 г. па 1 кастрычніка 1931 г. заданьне было 7.657.000, а выканана на 9.863.000.

Тры гады засад па валавой прадукцыі завод ідзе з перавыкананьнем.

А па зьніжэньні сабекошту такі-ж малюнак.

Запомнім яшчэ адну акалічнасьць. Завод «Бальшавік» сваімі хромавымі цэхамі забясьпечыў выкананьне пляну па хрому, як па сваім заводзе, так і па Віцебскім хромавым заводзе, які быў намочаны ў пяцігодцы.

Завод «Бальшавік» выканаў павялічаную праграму за першыя тры кварталы 1931 г. у колькасных паказьніках на 116,6 проц., а ў каштоўнасьцях —104,7 проц.

Прадукцыйнасьць працы расьце з кварталу ў квартал. У 1-м квартале—100,78 проц., у 2-м—112,09 проц., у 3-м —121,32 проц., усяго за 9 месяцаў— 110,82 проц.

Зьніжэньне сабекошту замест пляновых 4,32 проц.—9,31 проц.

За тры кварталы паступіла 444 рацыяналізатарскія прапановы супроць 212 за гэты-ж пэрыяд 1930 г. Па рацыяналізатарскім пляне было прадугледжана 166.000 руб. эканомі. Фактычна эканомія атрымалася 204.000 р.

Гэтых фактаў было-б дастаткова для таго, каб сказаць аб ударнай рабоце заводу. Але для большай пераканаўчасьці дадамо:

23 кастрычніка пленум ЦП саюзу рабочых гарбароў па дакладзе аб рабоце скурпрамысловасьці БССР вынес такое рашэньне.

— За большавіцкія тэмпы ў барацьбе за прамфінплян хадайнічаць перад урадам аб узнагародзе чырвонаштандарнага заводу «Бальшавік» вышэйшай узнагародай—ОРДЭНАМ ЛЕНІНА.

Няма яшчэ гэткай галіны работы на заводзе, якая праводзілася-б бяз удзелу і практычнай дапамогі з боку дэпутацкіх груп.

Не пасьпеем атрымаць заданьне, як пераварваюць ужо—гаворыць у цэхах. Яно на самай справе так. Разгарнулася работа па падрыхтоўцы да перавыбараў прафарганізацый. На заводзе абавечана самаправерка. Па ўсіх цэхах пайшлі праверачныя брыгады. Пайшлі і брыгады ад дэпутацкай групы, якія ўзялі на сябе самую баявую галіну заўкому — сацыяльна-бытавы сэктар, ЗРК, сталовую, ясьлі.

Але гэтага мала.

І самі дэпутаты былі праверены ля варштатаў.

Аказалася, што качагары ЛІСІЦА і ПАЎЛУШЫН, стругаль—ЗЯНЬКЕВІЧ, сартоўшчык ДУБЛІНЭРМАН, попельнік — МАЖЭЙКА, абрэзчыца—НАХАМАВА — лепшыя прэм'яваныя ўдарнікі, не маючы на сябе ніводнай плямы прарыву, самахвярна адданы заводу людзі. Часовым выключэньнем зьяўляецца ШЫМАНСКІ, былы вакум-апаратчык і тое адзінае «злачынства» гэтага дэпутата было ў тым, што перашоўшы на другую работу ён яшчэ не дае нормы.

Шыманскі абяцаў норму даць і ён яе дасьць.

***

Справы дэпутацкай групы гавораць самі за сябе. У нас няма сумненьня, што рулявыя з «Бальшавіка», якія ўключаюцца ў сацыялістычнае спаборніцтва за гонар быць у «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў», будуць у яе занесены, што дэпутаты з «Бальшавіка» паведуць за сабой на сацыялістычным буксіры дапамогі адстаючых.

Б. БРАДОЦКІ.

XIV гадавіну Кастрычніка БССР

адзначае вялізарнымі перамогамі ў будаўніцтве культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце

Усеагульнае навучаньне, буйны рост дашкольнага выхаваньня, напярэдадні ператварэньня БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, тысячы школ, сотні тэхнікумаў, ВНУ—вынікі правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі

Рабочая кляса і працоўныя масы пад кіраўніцтвам КП(б)Б яшчэ больш хуткімі тэмпамі пойдуць да далейшых перамог у галіне культурвай рэвалюцыі

Падарунак 25-ай ФЗС імя т. Чарвякова да XIV гадавіны Кастрычніка

Старшыні ЦВК СССР і ЦВК БССР і старшыні Ц.С. т-ва „П.Н.“ тав. Чарвякову

Рапарт

Працу па лініі т-ва «ПН» школа вядзе чацьверты год. За тры гады сваёй працы школай было абучана няпісьменных — першы год — 30 чал., другі — 150 чал., і ў трэцім годзе—250 чал.

На першым годзе праца па ліквідацыі няпісьменнасьці была разгорнута галоўным чынам сярод бацькоў вучняў.

На другім годзе, дзякуючы атрыманаму воньту і праведзенай шырокай растлумачальнай працы сярод вучнёўскіх мас, дзякуючы разгортваньню сацспаборніцтва ўдалося ўзьняць энтузіязм у гэтай рабоце, школа зрабіла вылазку ў масы няпісьменных чыгуначнікаў, галоўным чынам, у раёнах 742-га кілёмэтра, Козырава і калгасу «Чырвоная Зорка» (усяго было ахоплена 150 чал.).

У трэці год школа працягвала працу па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў саюзу Нархарчу, у калгасе «Чырвоная Зорка» і ў №-м артпалку. У гэтым-жа трэцім годзе была зьнішчана сіламі школы няпісьменнасьць на хімфармзаводзе, да якога была прымацавана школа (усяго было ахоплена 250).

Такім чынам за тры гады школай была ліквідавана няпісьменнасьць 430 асоб.

У сучасны момант школай ахоплена 117 чал. няпісьменных. Школа накіравала сваю працу на поўную ліквідацыю няпісьменнасьці сярод чыгуначнікаў службы цягі і ліквідуе рэшткі няпісьменнасьці сярод неарганізаванага насельніцтва ў сваім школьным раёне (23 няпісьменных і 94 малапісьменных наведваюць лікпункт у школе і больш няпісьменных у школьным раёне няма).

За працу па ліквідацыі няпісьменнасьці ў гэтым годзе ўзялося 7 настаўнікаў - ударнікаў і 55 вучняў культармейцаў таксама ўдарнікаў, якія пад мэтадычным кіраўніцтвам настаўнікаў ліквідуюць няпісьменнасьць.

Якімі мэтадамі школа праводзіла і праводзіць працу па ліквідацыі няпісьменнасьці?

1. Школа правяла арганізацыйнае разьмеркаваньне працы сярод культармейцаў (былі вызначаны брыгады па розных галінах працы, як напрыклад: брыгады па вывучэньні няпісьменных, брыгада па забесьпячэньні лікпунктаў алоўкамі, сшыткамі, падручнікамі брыгада па правядзеньні вучоту працы і адказная брыгада за інструктаж і г. д.).

2. Школай былі арганізаваны грамадзкія вечары разам з культармейцамі і няпісьменнымі; школа ўцягвала няпісьменных у культурна - грамадзкую працу і жыцьцё школы.

3. Быў наладжан грамадзкі кантроль і дапамога з боку прафсаюзных, школьных і вучнёўскіх арганізацый у працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

У выніку гэтага школа ня мела выпадкаў адсеву з лікпунктаў, а наадва рот былі выпадкі, калі няпісьменныя самі прыходзілі ў школу і прасіліся аб залічэньні іх на лікпункт.

За працу па ліквідацыі няпісьменнасьці школа была прэм'явана: у 1929-30 навучальным годзе—Учпрафсачам ст. Менск МББ чыг. і аддзелам асьветы МББ чыг. разам з гарсаветам «ПН». У 1930-31 навучальным годзе—гарадзкім саветам «ПН».

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб сярэдняй і пачатковай школе яшчэ больш узьняла энтузіязм настаўніцкіх і вучнёўскіх мас у справе перабудовы школы, уключэньні яе ў сацыялістычнае будаўніцтва — у тым ліку і на культурным фронце. Агульнымі намаганьнямі настаўніцкіх і вучнёўскіх мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі краіна саветаў да вызначанага тэрміну стане краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Няхай жыве XIV гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі!

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве чырвонасьцяжная настаўніцтва і пралетарскі вучань—змагары на культурным фронце!

Загадчык школы ЦМБГ
Адказны сакратар МК РАХІНСОН.
Адк. сакратар яч. «ПН» ЛІХАЧОВА.
Старшыня шкалькому САНТОЦКАЯ.

Будуецца літоўская ШКМ

У справе сацыялістычнага будаўніцтва рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі дасягнула вялізарных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, даўшы поўную магчымасьць працоўным усіх нацыянальнасьцяй будаваць сваю культуру сацыялістычную па зьместу і нацыянальную па форме.

Адным з посьпехаў у галіне культурнага будаўніцтва зьяўляецца пабудова Дыманоўскай літоўскай ШКМ (Лёзьнянскі раён), якая абслугоўвае рабоча-калгасную моладзь літоўцаў СССР.

Яшчэ ў восені 1930 г. пачалася пабудова 2-х павярховага цаглянага будынку, на што было асыгнавана 130.000 руб., будаўніцтва паспяхова быць закончана да 1 сьнежня 1931 г., зле ня гледзячы на гэта плян выкананы на 51 проц., што зьяўляецца вялікім недахопам.

Была нават пагроза канчатковага зрыву будаўніцтва, але дзякуючы на пружанай рабоце адміністрацыі, правільнаму кіраўніцтву з боку мясцовай партыйнэйкі, будаўніцтва за апошні месяц разгортваецца належнымі тэмпамі.

1. Каменная закладка аднаго корпуса закончана. Ідзе ўстаноўка крокваў і падрымтоўка да пакрышцця. Закладка 2 корпуса да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі будзе закончана. Маркуецца работа на працягу ўсёй зімы (сталярная і цясьлярская работы).

2. За апошнія два месяцы, на падставе прамовы т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, уведзена прагрэсыўна-прэм'яльная зьдзельшчына, разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва, утворан прэм'яльны фонд ударнікаў, што дало перавыкананьне заданьня брыгадамі на 10-21 проц. Узятыя за апошні час тэмпы гавораць аб тым, што пабудова будзе закончана пасьпяхова, толькі патрэбна яшчэ больш правесьці ў жыцьцё новыя мэтады работы, мабілізаваць унутраныя сродкі і рэсурсы.

Брыгада ўдзельнікаў пабудовы:
Галуніс, Герасімчык, Манюшыс, Глутненка, Зобак.

Старшыня ЦВК СССР і БССР тав. Чарвякоў—25 ФЗШколе сямігодцы

Горача вітаю вас, дарагія таварышы настаўнікі і вучні, в перамогамі на фронце барацьбы са зьлейшым ворагам сацыялістычнага будаўніцтва—няпісьменнасьцю—гэтай агіднай спадчынай панаваньня царызму. Барацьба за пісьменнасьць—гэта ёсьць барацьба за выкананьне аднэй з важнейшых дырэктыў камуністычнай партыі і ўраду. Таму вашы посьпехі на гэтым фронце зьяўляюцца лепшым паказьнікам таго, што школа сапраўды, па бальшавіцку эмагаецца за генэральную лінію партыі, даючы руйнуючы адпор усім малаверам, апартуністам, агентам кляса вага ворага.

Няхай ваш прыклад запаліць агнём энтузіязму іншыя школы, няхай спрыяе стварэньню новых тысяч культармейцаў, для разгорнутага наступленьня па ўсім фронце няпісьменнасьці.

Ня спыняйце вашай ўпартай бальшавіцкай працы. Пад сьцягам Леніна, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК наперад, да новых перамог за суцэльна-пісьменную краіну пераможнага сацыялізму.

А. Чарвякоў

Тэатр

„СПРАВА ГОНАРУ“

П'еса І. Мікітэнка

БДТ—1 першую сваю новую пастаноўку гэтага сэзону прысьвячае да **дню XIV гадавіны Кастрычніка.** 7 лістапада ён ставіць п'есу ўкраінскага пралетарскага драматурга т. І. Мікітэнко—**«Справа гонару».**

Краіна патрабуе вугалю!

А ў гэты час адна з шахт Данбасу здае тэмпы. Яна вырабляе толькі палову пляну. Няма ўздыму ў рабоце шахцёра.

Кіруе шахтамі інжынэр Павалоцкі. У яго да справы свой «псыхолёгічны» падыход:

...Шахта 32 не дадала сёньня 42 проц. заданьня. Павялічваецца лятунства, рвацтва і дэматогія на ботах. Вельмі неабходны сьмелыя і рашучыя захады. Прапаную прыстасаваць марксыцка-псыхолёгічны падыход з мэтаю ўзьняць настрой рабочых, а менавіта—зьменшыць сутачнае задань не напалову. Зьменшанае заданьне будзе выканана, а пасьля, звычайна, і перавыкананa, так Павалоцкі піша шахткому і дае загад зьнізіць заданьне.

Яго палкам падтрымлівае інжынэр—партыец Заруба, які знаходзіцца палкам пад яго ўплывам. Гэтага мягкацелага апартуніста падпарадкоўвае аплёмб Павалоцкага, з якім той праведзе свой шкодны «псыхолёгічны падыход».

Выпрацоўка вугалю падае і ў тэйжа час частка старых рабочых адыходзіць ад шахт. Гэтую групу аўтар увасабляе, галоўным чынам, у вобразе Ігната Арды:

Арда.—А хто гэта мяне хапае за руку? Я з камісарам Хрунзэ у адным батальёне біўся, а ён мяне хапае за руку! Да ты ведаеш, што гэта за рука? Ты ведаеш колькі разоў яна паранена, колькі прастрэлена?.. А ён—хапае.

Вырвізуб.—А хто вас папаша так абразіў?

Арда.—Хто?

Зануда.—Ну, так! Хто вашу баявую руку хапае?

Арда.—Пятрусь Сакалоўскі! Хто такі Пятрусь Сакалоўскі, я пытаюся? Камсамолія? А рэвалюцыю хто рабіў? Арда! Дык што-ж ты хапаеш, малюза, старога чырвонагвардзейца? Дык я-ж вазьму цябе на гэту вось мазолістую руку і пакажу табе ўсе дварцы і палацы, пакажу ўсе чырвоныя макаўкі, што парасьцьвіталі на нашых пакутах. Гэта-ж я цябе пабудаваў... А зараз мяне будзе вучыць Карманца, малдаванская дзяўчынка? А сын мой Іван, пралетарскі інжынэр, супрець бацькі, разам з Пятрусём і Карманцаем, у генэральную дудку іграе?..».

Ігнат Арда ня мірыцца з новымі веяньнямі ў шахтах, з новымі прыёмамі маладой камсамольскай работы, з мэханізацыяй вытворчасьці. Ён «абушком горы вуглю нарабіў», а тут «якаясьці камсамолія» наперад ідзе, нейкія ўрубавыя машыны ставіць.

Ён не разумее для чаго гэта ўсё і ён адыходзіць ад работы прагулывае, запівае.

Дарма работы ў шахтах прыязджае група нямецкіх шахцёраў, якія пад уплывам некаторых з жонак, бачачы дрэннае становішча работы,—зьбіраюцца ехаць назад у Нямеччыну.

Але у той-жа час шахцёрская моладзь шукае выхаду—з данага становішча, Моладзь ня можа цярпець ганебнага прарыву:

— Мая ня можа больш гуляць. Мая ня хоча гуляць!—кажа малады кітаец Ю-Та-Фу.

— Соромна з шахты вылазіць. Усе будзем на чорнай дошцы!

На чале з маладым савецкім інжынэрам, Іванам Ардою і сакратаром камсамольскага калектыву Карманцай—моладзь шукае выхаду і находзіць яго ў сыстэме бесьперапыннай работы машын.

Вялікі ўздым ахапляе усю моладзь. Ня гледзячы на супраціўленьне інжынэраў Павалоцкага і Зарубы, пры дапамозе партыйнага калектыву моладзь дабіваецца свайго: бесьперапынная работа ўведзена.

Брыгада Івана Арды выклікае на сацспаборніцтва брыгаду немцаў і старых рабочых. Сацспаборніцтва разгортваецца. Клясавае пачуцьцё Ігната Арды і рабочых немцаў паказвае ім правільны шлях, яны уступаюць ў спаборніцтва.

Разьвіваюцца ўдарныя тэмпы ў рабоце—плян выкананы і перавыкананы.

———

П'еса напісана жывой простай мовай. Шмат дзейнасьці. Цікавыя дыялёгі, цікавае становішча.

Чырвоная нітка праходзіць праз усю п'есу, выклікаючы вялікі ўздым, адно:—

«Праца—гэта справа гонару, справа славы, справа доблесьці і гэройства».

———

«Справа гонару» будзе добрым падарункам да Кастрычнікавых сьвят.

П'есу павінны бачыць усе рабочыя, усе працоўныя Меноку.

Прафсаюзы павінны арганізаваць калектыўныя прагляды гэтай п'есы.

М. Хаванскі.

Акупацыйная армія павялічваецца

Японскія імпэрыялісты захапляюць новыя тэрыторыі, ствараюць „незалежныя“ ўрады ў Манчжуры

ТОКІЁ. Паводле паведамленьня «Асахі» Ю-Чун-Кан выехаў у Мукдэн з мэтаю «аказаць дапамогу Юэн-Цьзін-Каю, а таксама прыняць кіраўніцтва ўпраўленьнем Манчжурыяй. Праграма гэтага новага японскага стаўленіка прадугледжвае «разбраеньне Манчжурыі».

***

ТОКІЁ. 4-XI. Паводле паведамленьня Рэйтэр із Мукдэну, японскае войска 2 лістапада заняла Тунляо. Заняцьце гэтага пункту Японія лічыць неабходнасьцю для «абароны» Чжэнцзятунь-Тунляоскай чыгункі, пабудаванай на японскія капіталы. Сёньня прадстаўнік міністэрства замежных спраў пацьвердзіў паведамленьне аб адпраўцы 500 салдат для аховы размонтнай групы Ю.-М. чыгункі, пасланай для аднаўленьня маста.

***

Токіё. 4-XI. Як паведамляе Дэмпо Цусін з Цыцыкара, мясцовая ўлада за бараніла чужаземцам рабіць падарожжа ў ваколіцах Цыцыкара з прычыны «пануючых там непарадкаў».

Японскае войска захапляе новыя гарады

ТОКІЁ. 3-XI. Вайсковы міністр Мінамі паведамляе, што ў сувязі з невыкананьнем генэралам Ма абяцаньня аднавіць мост праз раку Іоні, камандуючы акупацыйнай армі Хоньдзо аб вясьціў аб рашэньні накіраваць рамонтную групу пад аховай японскага войска на аднаўленьне гэтага маста. Адначасова генэрал Ма папярэдзіў, што ў выпадку спробы перашкодзіць рамонту маста, японскае войска «прыме належныя меры».

Патрабаваньне адстаўкі Чан-Кай-Шы

ШАНХАЙ. 3-XI. Кантонская дэлегацыя апублікавала заяву, у якой выказвае жаданьне, каб Чан-Кай-Шы ад мовіўся ад паста старшыні нанкінскага ўраду, з тым, каб прыняць на сябе старшынства ў «савеце абароны», калі арганізацыя гэтькага савету будзе ажыцьцёўлена.

***

ШАНХАЙ. 3-IX. На аб'яднанай Нанкінска-Кантонскай канфэрэнцыі Чан-Кай-Шы зрабіў прамову, у якой рэзка заявіў, што ня можа згадзіцца з прапановай кантонцаў аб адмаўленьні ад паста старшыні ўраду.

Забастоўка партавых рабочых шырыцца

ГАМБУРГ. 3-XI. Забастоўка гамбурскіх партавікоў працягваецца. Бастуючыя стварылі ў гавані рад пікетаў для барацьбы са штрэйкбрэхерствам. Учора адбылася сутычка паміж бастуючымі рабочымі і паліцыяй. Адзін рабочы цяжка і некалькі лёгка паранены. Паліцыя арыштавала 7 прадаўцоў камуністычнай газэты «Ротэ вахт». Прадпрыемцы прымаюць усе меры, каб утоіць факт забастоўкі ад зьнешняга сьвету. Настрой партавікоў, ня гледзячы на люты тэрор паліцыі—баявы.

Кэлёг паслаў Брыяну тэлеграму наступнага зьместу: «Віншую вас з бліскучымі дзеяньнямі па мірным ўрэгуляваньні кітайска-японскага канфлікту. Ваш аўтарытэт дае самыя вялікія надзеі на падтрыманьне ўсеагульнага міру». (З газэт).

„Гарантыя міру“ або...

Інструмант новай імпэрыялістычнай вайны

Чаго Пілсудзкі езьдзіў у Румынію

Падрыхтоўка збройнага нападу на СССР на поўным ходзе

ВАРШАВА. 3-XI. «Ілюстраваны кур'ер цодзённы» (выходзіць у Кракаве) зьмяшчае сэнсацыйную «тэлеграму» варшаўскага карэспандэнта «Чыкага трыбун», у якой гаворыцца: «З блізкіх да маршала Пілсудзкага колаў карэспандэнт даведаўся, што ў часе апошняга таемнага прабываньня маршала ў Румыніі былі скончаны перагаворы, якія вяліся прадстаўнікамі румынскага генштабу і братам румынскага караля Міколай у Варшаве.

Польская і румынская армія, якія складаюць разам 700.000 чалавек, у выпадку вайны будуць знаходзіцца пад агульным камандваньнем маршала Пілсудзкага, які будзе прызначаны маршалам польскім і румынскім.

Карэспандэнт «Чыкаго трыбун» дадае, што паведамленьне аб гэткім рашэньні выклікала вялікае здавальненьне ў вайсковых колах, бо «асоба маршала Пілсудзкага дае гарантыю належнай баявой вывучкі дзьвюх аб'яднаных найбольш буйных армій усходняй Эўропы». Адначасова «Кур'ер цодзённы» зьмяшчае паведамленьне з Варшавы, у якім адхіляецца паведамленьне аб прызначэньні маршала Пілсудзкага генэралісімусам польскай і румынскай армій і зазначаецца, што, апроч нядаўна адпраўленых згод, ніякіх новых дагавораў заключана ня было.

Катаржныя прыгазары ў Польшчы

ВАРШАВА. 3-XI. Акруговы суд у Лёдзі вынес прыгавор па справе 22 членаў ППС—лявіцы. 4 абвінавачаных прыгаворваны да 4-х год, 11 чалавек—да 2-х год катаржнай турмы, 7 чалавек апраўданы.

Лёзунгі да XIV гадавіны Кастрычніка

1. Няхай жыве XIV гадавіна Кастрычніка! Няхай жыве надыходзячы сусьветны Кастрычнік!

2. Рабочыя і работніцы ўсіх краін! Працоўныя і прыгнечаныя калёніі! У дзень XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі—вышэй сьцяг Леніна!

3. Пралетары і прыгнечаныя народы ўсяго сьвету! Мацней удар па загніваючым капіталізме! За дыктатуру пралетарыяту! Няхай жыве Камінтэрн—баявы штаб сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

4. Толькі зьнішчэньне капіталізму і перамога сацыялізму пазбавіць рабочую клясу ад крызісу, беспрацоўя, галечы. Далоў капіталізм, няхай жыве сацыялізм!

5. Крызіс у капіталістычных краінах асуджае на голад дзесяткі мільёнаў беспрацоўных. У СССР ліквідавана бесправацоўе, ідзе няўхільны ўздым жыцьцёвага ўзроўню працоўных. Пралетары ўсіх краін! Зьвяргайце капіталізм, ідзеце па шляху рабочых СССР!

6. Пакутуючым у турмах вязьням капіталізму, ахвярам фашысцкага тэрору, братом па клясе—пралетарскае прывітаньне рабочых СССР!

7. Імпэрыялісты арганізуюць эканамічную блёкаду Савецкага саюзу, яны рыхтуюць новую вайну супроць рабочых СССР. Пралетары ўсіх краін, на абарону СССР—бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту! Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба рабочых усіх краін супроць імпэрыялістаў!

8. Пралетары ўсіх краін! Інтэрнацыянал—апошняя апора капіталізму. Ганьце прэч правадыроў сацыял-дэмакратыі і іх «левую» агентуру! Станавецеся пад сьцягі ленінскага Камуністычнага інтэрнацыяналу!

9. Імпэрыялісты Японіі, Эўропы і Амэрыкі праводзяць палітыку падзелу Кітаю і прыдушэньня кітайскай рэвалюцыі. Пралетары ўсяго сьвету! Абараняйце кітайскую рэвалюцыю! Няхай жыве рэвалюцыя ў Кітаі! Далоў імпэрыялізм!

10. Няхай жывуць саветы і гераічная Чырвоная армія Кітаю!

11. Толькі савецкая ўлада можа пазбавіць сьвет ад войнаў і імпэрыялізму. Далоў падпальшчыкаў вайны, імпэрыялістаў і сацыял-дэмакратыю! Няхай жыве савецкая ўлада на ўсім сьвеце!

12. Толькі Савецкі Саюз зьяўляецца сапраўднай і моцнай апорай міру. Няхай жыве савецкая палітыка міру!

13. У краінах капіталізму расьце хваля стачак, узмацняецца рух беспрацоўных, расьце новы ўздым рэвалюцыйнага руху. Пралетары ўсіх краін! Згуртуйце свае рады вакол камуністычных партый!

14. Няхай жыве Чырвоная армія СССР, узброеная апора сацыялістычнага будаўніцтва, пільны вартавы савецкіх межаў!

15. Посьпехі пяцігодкі — рашучы ўдар па сусьветным капіталізме. Заканчым перамогай пяцігодку ў чатыры гады!

16. Дагонім і перагонім у найкарацейшы тэрмін перадавыя па тэхніцы капіталістычныя краіны! Няхай жывуць бальшавіцкія тэмпы!

17. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё. Няхай жыве бальшавіцкая барацьба за аўладаньне тэхнікай!

18. Падвысім вытворча - тэхнічную кваліфікацыю рабочых! Створым новых спэцыялістаў з людзей рабочае клясы!

19. Рабочыя-мэталюргі! Сталью і чыгуном узмацняйце магутнасьць сацыялістычнай індустрыі. Бальшавіцкімі тэмпамі дамажэцеся перамогі ў вялікай барацьбе за мэталь!

20. Прывітаньне рабочым Данбасу, няўхільна падвышаючым здабычу вугалю. Рабочыя вугольных раёнаў! Ідзе па прыкладзе Данбасу!

21. Рабочыя-чыгуначнікі! Наперад за не руху, за ўкараненьне жалезнай дысцыпліны, за поўны посьпех транспарту!

22. У бязьлітасным барацьбе з расізмам, з коснасьцю дамажэмся рату!

23. Ударнікам — перадавым байцом за справу сацыялізму—бальшавіцкае прывітаньне! Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва!

24. Ганьба дэзарганізатарам сацыялістычнага будаўніцтва — лятуном, рвачом і прагульшчыкам. Няхай жыве пралетарская дысцыпліна ў прамысловасьці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы!

25. Арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьнем калгасаў узьнімем калгасны рух на новую ступень, ліквідуем кулацтва як клясу! Няхай жыве калгаснае сялянства—цьвёрдая апора савецкай улады!

Няхай жыве саюз рабочых і сялян, якія будуюць і ўзмацняюць калгасы!

26. Барацьба за збожжа—барацьба за сацыялізм! Мацней удар па кулаку, па рвачох, па дэзарганізатарах збожжазагатовак! Ніводнага цэнтнера прыватніку! За выкананьне пляну збожжа загатовак!

27. Узьнімем гарадзкую гаспадарку. Палепшым быт працоўных. Ператворым гарады ў культурныя, гаспадарча разьвітыя пралетарскія цэнтры!

28. Прафсаюзы! Бліжэй да мас, у цэх, брыгаду, групу!

29. Зьнішчэньнем дробнабуржуазнай уладкі, перабудовай тарыфнай сыстэмы, укараненьнем гаспадарчага разьліку забясьпечым магутнае падвышэньне прадукцыйнасьці працы!

30. Ператворым сталоўкі ва ўзорны цэх харчаваньня. Палепшым грамадзкае харчаваньне!

31. Завяршым перабудову работы каапэрацыі тварам да вытворчасьці! Разгорнем савецкі гандаль! Палепшым забесьпячэньне рабочых!

32. Уцягнем мільёны рабочых і калгасьнікаў у кіраваньне дзяржавай! Выкарчуем рэшткі бюракратызму ў дзяржапараце!

33. Вышэй сьцяг марксыцка-ленінскай тэорыі! Навуку, усе дасягненьні культуры—на службу разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню!

34. У краіне, уступіўшай у пэрыяд сацыялізму, не павінна быць няпісьменных. Ператворым СССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці!

35. За школу камуністычнага выхаваньня і політэхнічнай асьветы! Ажыцьцёвім усеагульнае сямігадовае навучаньне. Падрыхтуем актыўных сьвядомых барацьбітоў за сацыялізм!

36. За ленінскую нацыянальную палітыку, за адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР!

37. Кастрычніцкая рэвалюцыя разьняволіла работніцу і сялянку. Павялічым ролю працоўных жанчын ў грамадзкім і вытворчым жыцьці краіны!

38. Камсамольцы! У перадавыя шарэнгі ў барацьбе за сацыялізм, у барацьбе за індустрыялізацыю, за аўладаньне тэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў!

39. Юныя піянэры! Дзеці Кастрычніка! Будзьце татовы працягваць і завяршыць вялікую справу Леніна, справу сусьветнага Кастрычніка!

40. Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр і арганізатар пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі!

41. Рабочыя, калгасьнікі, усе працоўныя! Шчыльней рады вакол УсеКП(б), за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы, за перамогу сацыялізму!

42. Прэч дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня—правых і «левых» апартуністаў! Няхай жыве ленінскае адзінства бальшавіцкіх радоў!

43. Пад сьцягам бальшавіцкай партыі, яе ленінскага ЦК наперад да новых перамог! Вышэй сьцяг УсеКП(б)—арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі!

ЦК УсеКП(б).

Г. Брыгневіч

Перамогі на фронце культурнай рэвалюцыі

«Ва ўмовах пралетарскай дыктатуры, пры растучай творчай актыўнасьці і непасрэдным удзеле рабочых, калгасных і бяднацка-сераднацкіх мас сялянства, Беларусь, разьвіваючы нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу культуру, гарантуючы загайваючы раны, нанесеныя бела-польскімі акупантамі,—ператварэньне з культурна-занапалага раёну ў культурную перадавую рэспубліку». (З рэзалюц. Прэзыд. Савету Нац. ЦВК Саюза ССР).

Да Кастрычніцкае рэвалюцыі Беларусь—адна з самых заняпалых акраін былой царскай імпэрыі. Пісьменнасьць у ёй была ня звыш 20 проц. усяго насельніцтва; працоўныя масы былі пазбаўлены магчымасьці культурнага разьвіцьця на роднай мове; мэзэрная колькасьць школ; пачатковая школа, амаль выключна «церковно-приходская» мела на мэце толькі адно: укараніць у насельніцтва «истинно-русское начало».

Беларусь—арэна імпэрыялістычнай вайны, акупацыі, барацьбы з белапалякамі. Гэта прыводзіць краіну амаль да поўнага эканамічнага і культурнага заняпаду.

Буйны рост сацыялістычнага будаўніцтва індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны, ліквідацыя кулацтва як клясы на гэтай базе, шырачэзны ўдзел працоўных мас у справе культурнага будаўніцтва, — забясьпечылі шпаркі рост тэмпаў культурнага будаўніцтва, якія з году ў год нарастаюць.

Дашкольнае выхаваньне. У 1921-22 годзе мы мелі па БССР усяго 39 дашкольных устаноў з ахопам 1631 чал.; у 1930-31 годзе—2426 розных тыпу дашкольных устаноў з ахопам у 87500 чал. Дзеці рабочых і батракоў складаюць 79 проц. агульнага ліку, дзяцей дашкольных устаноў. Па пляну 1932 году прадугледжаецца ахапіць дашкольнымі установамі 50 проц. дзяцей дашкольнага ўзросту, што складае 316.000 дзяцей. З гэтага кантынгенту будзе ахоплена поўнасьцю (100 проц.) дзяцей рабочых і работніц, 60 проц. дзяцей гарадзкога насельніцтва, 50 проц. дзяцей калгасьнікаў і каля 20 проц. іншага вясковага насельніцтва. У 1932 годзе будзе ўведзена для дзяцей рабочых абавязковасьць навучаньня ў дашкольных установах.

Ліквідацыя няпісьменнасьці. За час рэвалюцыі ліквідавана няпісьменнасьць сярод дарослых каля аднаго мільёну чалавек, пры чым за апошнія 2 гады—каля 700.000 чалавек, у той час, калі ліквідавана няпісьменнасьць: у 1924-25 годзе—39.046 чал., у 1925-26 годзе—42.000 чал., у 1926-27 годзе—70.073 ч., у 1927-28 годзе—52.670 ч. і ў 1929-30 годзе—225.470 чалавек.

Тэмпы зьнішчэньня няпісьменнасьці адбіваюць агульныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Год завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі зьяўляецца аднначасова і годам барацьбы за суцэльную пісьменнасьць.

Зараз перад намі стаіць задача: **ператварыць БССР да 1-га мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.** Для гэтага трэба ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 300.000 чалавек, ахапіць школамі малапісьменных ня менш 280.000; школамі дарослых 2-га канцэнтру, рабочай і калгаснай асьветай—да 120.000 чалавек, разгарнуўшы працу па ажыцьцяўленьні лёзунгу ўсеагульнага тэхнічнага навучаньня.

Усе навуч. БССР—першая з савецкіх рэспублік увяла абавязковасьць навучаньня. Пасьля ўстанаўленьня СНК канчатковых прынцыпаў і тэрмінаў увядзеньня абавязковасьці навучаньня ў 1926 г. месцы пачалі разгортваць гэтую справу, пачынаючы з 1927-28 навуч. году і па ўсёй БССР усенавуч быў уведзен канчаткова ў 1929-30 годзе.

Лік школьных камплектаў 1-га канцэнтру палітэхнічнай школы павялічыўся ў 1930-31 годзе з 10.991 да 12.932, гэта значыць на 1.191 камплект, або на 18 проц. Супроць пляну лік адчыненых камплектаў 1-га канцэнтру перавышан на 164, ці на 8,7 проц. Лік вучняў у 1-м канцэнтры павялічыўся з 518.000 да 582.000, г. зн. на 64.000 ці на 12,3 проц.

У 1930-31 годзе школу наведвала дзяцей 8-10 гадовага ўзросту 97 проц. агульнага ліку дзяцей гэтых узростаў. Усе існаваўшыя да гэтага году школы з 3-х гадовым курсам навучаньня пераведзены на 4-х гадовы курс навучаньня.

Агульны лік школ 2-га канцэнтру ў 1930-31 навучальным годзе павялічыўся ў параўнаньні з мінулым годам на 163 (з 413 да 586) ці на 40 проц.; лік вучняў у 2-м канцэнтры павялічыўся на 11.700 ці на 18 проц.

Па БССР ішоў ясупынны рост школ на мове нацыянальных меншасьцяй; так, яўрэйскіх школ 4-х годак у 1924-25 годзе было 87, у 1930-31 годзе—219, польскіх у 1924-25 годзе—94, у 1930-31 г.—149. 7-годак яўрэйскіх у 1924-25 г. было 42, у 1930-31 г.—80 школ. Польскіх школ у 1924-25 г. было 5, у 1930-31 г.—19. На мовах іншых нацменшасьцяй расійскай, літоўскай, украінскай, нямецкай, эстонскай школ 4-х годкаў было ў 1924-25 г. 14, у 1930-31 г. звыш 50, сямігодак: у 1924-25 г. была адна, зараз—6.

У 1932 годзе ўводзіцца абавязковае навучаньне ў 5-й групе 2-га канцэнтру палітэхнічнай школы для ўсіх скончыўшых 4-ую групу 1-га канцэнтру.

Прадугледжваецца арганізацыя ў 1932 годзе ў вясковых мясцовасьцях ня менш 2-3 узорных політэхнічных 7-гадовых школ на раён.

Запраектоўваем адчыненьне ў 1932 годзе ў вясковых мясцовасьцях да 1000 інтэрнатаў пры 7-гадовых школах з ахопам 40.000 вучняў.

Аднначасова ідзе бурны рост сеткі прафасьветы. Да рэвалюцыі на Беларусі ня было ніводнае вышэйшае школы, існавалі адзінкі сярэдняй прафасьветы (рамесьныя школы).

Да 1928-29 году лік прафнавучальных устаноў даходзіць да 95 з ахопам каля 17.000 чал. У 1930-31 годзе—271, з ахопам каля 50.000 студэнтаў. У 1931-32 г. сетка гэтых устаноў расьце ня менш шпаркімі тэмпамі.

За апошнія гады, пад кіраўніцтвам партыі, органы народнае асьветы праробілі вялікую работу па забесьпячэньні прыёму ў ВНУ, рабфакі, тэхнікумы і прафшколы з пралетарскіх і клясава-блізкіх да пралетарыяту пластоў насельніцтва і па ачыстцы навучальных устаноў ад чуждых і варожых пралетарыяту элемэнтаў.

Зараз «наша краіна ўступіла ў такую фазу разьвіцьця, калі рабочая кляса павінна стварыць сябе свае, правільнай ленінскай нац. палітыкі нашай партыі і ўлады, дзякуючы на пружанай барацьбе за генэральную лінію партыі ў культурным будаўніцтве.

З года ў год расьце матэрыяльная база культурнай рэвалюцыі. Рост бюджэтаў на нарасьвету па БССР (па мясцовым і дзяржаўным каштарысу) характарызуецца наступнымі лічбамі:

Г А Д Ы	Дзяржаўны бюджэт	Мясцовы бюджэт	Разам
1927 28 . . .	9890,8	15741,6	25632,4
1929 30 . . .	19454,0	31270,8	50724,8
1931 . . .	35301,9	48613,1	83915,0
Маркуецца на 1932 г. .	61426,1	98120.0	159546,6
Процант росту . .	74	101,8	90,1

Выкананьне народна - гаспадарчага плану на 1931 г., пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі—значна замацоўвае матэрыяльную базу культурнай рэвалюцыі. Гэта значыць, што мы маем усе аб'ектыўныя ўмовы для новага культурнага ўздыму, далейшага паскарэньня тэмпаў культурнага будаўніцтва.

На кіраўнікох культурнага фронту, ляжыць задача—выказваньне пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм.

Мы праводзім школу на рэйкі палітэхнізму. Школа ў асноўным праводзіць шырокую прамадзка-карысную працу, якая ўвязана з гаспадарча-палітычнымі і вытворчымі задачамі краіны. Школа пераходзіць на актыўныя мэтады працы. Мы шчыльна падыходзім да ажыцьцяўленьня паказаньняў Маркса: «Злучэньне аплачванай вытворчай працы з разумовым разьвіцьцём, фізычнымі практыкаваньнямі і політэхнічнай падрыхтоўкай, падыме рабочую клясу на куды больш высокі ўзровень, чым той, на якім знаходзіцца цяпер вышэйшая і сярэдняя клясы грамадзтва».

Настаўнік, асьветнік часта даюць лепшыя ўзоры працы па новаму ў барацьбе за рацыяналізацыю пэдагагічнага працэсу, падвышаючы свой культурна-політычны ўзровень, аўладаючы тэхнікай пэдагагічнага працэсу.

Перамогі на культурным фронце дасягнуты толькі ў непрымірымай барацьбе працоўных

Супроць кампанейшчыны—за сталую, плянавую канкрэтную абаронную работу

Рэйд па агляду абароннай работы выявіў значныя дасягненьні і побач з гэтым слабасьць кіраўніцтва Менскага гарсавету і Церахоўскага райсавету Асоавіяхіму нізавымі арганізацыямі

Узмацніць работу Асоавіяхіму, шырэй масавую работу!

Менскі райсавет Асоавіяхіму слаба змагаецца за пашырэньне сваіх дасягненьняў

Задача ліквідацыі вайсковай няпісьменнасьці сярод працоўных мас зьяўляецца адной з галоўнейшых задач сучаснага моманту.

На гэтым фронце г. Менск мае значныя дасягненьні.

Асоавіяхімаўскія арганізацыі былі першымі заспрэлышчыкамі па зборы сродкаў на грамадзянскую авіацыю, пры чым было сабрана 5700 руб.

Але побач з дасягненьнямі ёсьць цэлы рад недапушчальных недахопаў і вядбайных адносін з боку гарсавету Асоавіяхіму да нізавых арганізацый.

Няма сапраўднага вучоту камандзіраў запасу і яны недастакова скарыстоўваюцца, а калі запытаецца чаму, напрыклад, не працуюць гурткі дык атрымаеш адказ: «няма кіраўніковуякія-б кіравалі гэтай справай». На заводзе **«Дрэваапрацоўшчык»** гурткі зусім не працуюць, як быццам, з-за адсутнасьці кіраўніковуі, у той час калі на заводзе ёсьць камандны склад запасу і не скарыстоўваецца. Гэта яўны факт недацэнкі вайсковай работы з боку партарганізацыі заводу, якая павінна дапамагаць ячэйкам Асоавіяхіму і даць магчымасьць займацца вайсковым гуртком.

Ёсьць цэлы рад ячэек, якія зусім дрэнна захоўваюць і скарыстоўваюць зброю. Прыклад гэтага **завод імя Варашылава**—тут у ячэйцы Асоавіяхіму ёсьць дробнакалібарныя вінтоўкі, але ўсе яны знаходзяцца па руках.

Гарсавету Асоавіяхіму патрэбна даць ячэйкам інструкцыі аб захоўваньні і скарыстаньні зброі і сачыць за выкананьнем гэтых інструкцый.

На заводзе **«Балышавік»** заняткаў у хімічных камандах ніякіх не праводзіцца. Каманды тлумачаць гэта тым, што кіраўніцтва павінна ісьці непасрэдна са штабу СПА, а не ад сэкцыі СПА гарсавету Асо.

Ячэйка Белкаапсаюзу мела каманды колькасьцю звыш 200 чалавек. Зараз начальнік аб'екту Белкаапсаюзу загадаў каманду распусьціць.

Гарсавет Асоавіяхіму слаба клапаціцца аб тым, каб у нізавых ячэйках абсталяваць вайсковыя куткі, забясьпечыўшы іх літаратурай, плякатамі і г. д.

Вайсковых куткоў налічваецца вельмі мала, толькі па буйных прадпрыемствах. Партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі ня ідуць насустрэч і не дапамагаюць ячэйкам Асоавіяхіму.

Камсамольскае, вайсковае абучэньне праходзіць дрэнна, ахоплены толькі каля 50 проц. камсамольцаў. Праўда, з мінулага году справа палепшылася, але гэта яшчэ не перамога. Патрэбна ўзяцца за справу больш энэргічна ня толькі гарсавету Асоавіяхіму, але і Гаркому ЛКСМ.

Справа па дапамозе грамадзянскай авіацыі па зборы сродкаў стаіць кепска. Адміністрацыі прадпрыемстваў не здаюць тых грошай, якія рабочыя адлічылі ці адпрацавалі.

Напрыклад, на заводзе **«Кастрычнік»** рабочыя пастанавілі адлічыць 2 проц. заработку, а грошы не здадзены. Завод **«Балышавік»** адпрацаваў адзін дзень, а адміністрацыя грошай не здае. Тое самае на шчотачнай і хлебазаводзе.

Такія адносіны з боку дырэкцыі заводаў нікуды ня варты, гэта яўная недацэнка справы грамадзянскай авіацыі.

Білеты 5 лётарэі Асоавіяхіму рэалізаваны здавальняюча, але задоўжанасьць па ячэйках складае 40 прац. Гэта тлумачыцца нядбайнасьцю некаторых ячэек, а таксама і гарсавету Асоавіяхіму.

Падрыхтоўкі да рэалізацыі білетаў 6 лётарэі Асоавіяхіму яшчэ ніякай не вядзецца.

Зусім дрэнна справа абстаіць з выпіскай вайсковай літаратуры і асьвятленьнем вайсковай работы ў насьценгазэтах.

Гарсавету Асоавіяхіму патрэбна зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэту галіну работы і правесьці шырокую кампанію па выпісцы вайсковых газэт і часопісаў.

Ударная брыгада «Сав. Бел.»
Я. Журовіч В. Харытановіч.

Пашырыць абаронную работу

На Менскім дражджавым заводзе **«Чырвоная зара»** ёсьць 200 рабочых, ячэйка-ж Асоавіяхіму налічвае толькі 60 членаў.

Пасьля манэўраў ячэйка Асоавіяхіму гэтага заводу амаль зусім спыніла работу. Не праводзяцца сходы, няма заняткаў гурткоў, куткі ваенізацыі ніхто не наведвае.

Партарганізацыя заводу не цікавілася ні разу заслухаць справаздачу сакратара Асоавіяхіму на сходзе. Ячэйка ЛКСМ налічвае 25 чалавек, яны ўсе зьяўляюцца членамі Асоавіяхіму, але ў рабоце Асоавіяхіму камсамольцы не дапамагаюць і нават ня плацяць узносаў.

Заводская газэта «Чырвоная зара» абаронай рабоце месца зусім не дае.

У насьценгазэце клюбу яшчэ месяц таму назад зьмешчаны выклік рабочага заводу т. **Віталіна** аб узносах грашай на пабудову эскадрыльлі ім. **Леніна**. Ён унёс на гэту справу 5 руб., але ні ячэйка Асоавіяхіму, ні партыйная, ні камсамольская арганізацыі не разгарнула работы вакол гэтага пачыну.

Партарганізацыі заводу трэба заняцца абаронай справай, узьняць работу Асоавіяхіму на належную вышыню.

Брыгада газэты «Сав. Бел.»:
Масаловіч Я. Капыткоў В.

„Будзем узмацняць баявую мэц Чырвонай арміі“

СЛУЦАК. (Наш кар.). 18 кастрычніка адбыўся сход прызыўнікі у Чырвоную армію, прысьвечаны іх провадам.

Сход і вечар прайшлі в вялікім уздымам.

Па дакладу аб задачах Чырвонай арміі прызыўнікі прынялі наступную рэзалюцыю:

«Мы, будучыя байцы РСЧА ўліваючыся ў яе рады, запэўніваем камуністычную партыю і застаўшыхся на фабрыках і калгасных палёх, што мы па бальшавіцку будзем узмацняць баявую мою Чырвонай арміі, вывучаць вайскова-палітычную справу, вывучаць тэхніку, прыкладна яе захоўваць, памятаючы аб тым, што пры дрэнна вывучанай тэхніцы мы небаяздольныя.

Будзем змагацца за жалезную рэвалюцыйную дысцыпліну, зз байцы і часьць ня маючых ніводнага ўчынку і, калі капіталісты захочуць напасьці на межы СССР, мы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дамо ім рашучы адпор.

Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр і арганізатар РСЧА.

Няхай жыве кіраўнік РСЧА тав. Варашылаў».

А. Курдо.

Завод імя К. Е. Варашылава шырока разгортвае работу па СПА

Зараз справа вядзецца па лініі вучобы ў напрамку ліквідацыі хэмічнай няпісьменнасьці, трэнірованьня ў работе з супрацьгазамі, у рабоце па дэгазацыі і па вывучэньні справы сувязі. Некалькі перашкаджае рабоце адсутнасьць праграм для заняткаў, якіх не дае штаб СПА і таму работа ідзе толькі пад кіраўніцтвам Асоавіяхімарганізацыі заводу.

Заняткі вядуцца акуратна, але яны затрудняюцца недахватам інструктароў; штаб СПА іх не дае, а сваіх мала.

22 кастрычніка была праведзена вэпытная трывога СПА, на якой ўсе рабочыя зьявіліся на завод за 15 хвілін, а за 25 хвілін завод быў гатовы да абароны. Лепшыя вынікі далі аддзяленьні дэгазацыі, санітарнае, а таксама сувязі.

Рэдакцыя газэты **«Чырвоны Молат»** у часе трывогі праз кожныя 15 хвілін выпускала газэту **«На варце»**. А ў нумары за 2 лістапада «Чырвоны Молат» зьмясьціў вынікі работы СПА, і Асоавіяхімарганізацыі заводу, дзе даў рад заўваг у гэтай справе.

Завод імя Варашылава добра разгортвае работу, але для далейшага развіцьця яе неабходна ўзмацніць кіраўніцтва гэтай работай як з боку штабу СПА, таксама і з боку райсавету Асоавіяхіму.

Брыгада «Сав. Бел.»:
Я. Масоковіч, В. Капыткоў.

Церахоўская арганізацыя Асоавіяхіму бязьдзейнічае

Ня гледзячы на спрыяючыя ўмовы, у **Церахоўскім раёне** ніжай вайсковай работы не вядзецца. Райсавет Асоавіяхіму нічога ня робіць. Невядома колькі ёсьць ячэек і членаў Асоавіяхіму.

РК КП(б)Б, ЛКСМБ і прафарганізацыі вайсковай справай ня цікавяцца.

Усе вайсковыя гурткі распаліся.

Камандзіры запасу і адпускнікі чырвонаармейцы ў радох Асоавіяхіму павінны быць застрэльшчыкамі, а яны да гэтай работы ня прыцягнуты.

Дрэнна абстаіць справа ў раёне з вайсковай літаратурай. Амаль што ніводная партыйная ці камсамольская ячэйка ня выпісвае вайсковых газэт. Па раёне вайсковай літаратуры зусім мала. Праўда, пры школах ёсьць маленькія бібліятэчкі па 15-20 кніг, але кнігі ў масу не прасоўваюцца!

Ёсьць шмат асоавіяхімаўскай літаратуры і плякатаў у **шафе райсавету**, якія таксама ляжаць бяз усякай карысьці. **Райбібліятэка на вайсковую справу ўвагі не зварочвае.**

Распаўсюджваньне білетаў 5 лётарэі Асоавіяхіму прайшло зусім дрэнна. Агітмасавай работы і літаратуры ў час распаўсюджваньня ня было. Білеты не распаўсюджваліся, а часам на вязваліся.

Да гэтага часу білеты яшчэ не распаўсюджаны па ячэйках. Барыцкоўскай ячэйцы далі білетаў на 200 руб., а распаўсюджана на 70 руб., астатнія ляжаць. Таксама абстаіць справа і ў іншых ячэйках. Райсавет па гэтым пытаньні мацчыць.

Збору членскіх узносаў і вучоту выплаты іх ніхто ў раёне не вядзе. «Колькі здалі, столькі і будзе»—так адказваюць некаторыя з сакратароў ячэек.

Рэўкамісіі лічацца толькі на паперы. Па школах, саўгасах і калгасах вельмі цікавяцца стральковай справай, але яна нідзе не праводзіцца. Калі мы заглянем у шафу Райсавету Асоавіяхіму, дык убачым, што там разам з лётарэйнымі білетамі, ляжыць шмат дробнакалібарных патронаў, а для якой мэты яны ляжаць і хаваюцца—невядома.

Тавары, узятыя для продажу, напрыклад, сьцізорыкі і г. д. паржавелі і ўжо нягодны для продажу.

Па ячэйках, школах, саўгасах і калгасах раёну наглядаецца такое-ж становішча з доглядам зброі і кашэчных рэчаў.

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР і райком партыі павінен абсьледаваць работу Асоавіяхіму ў Церахоўскім раёне і прыняць належныя меры да ўкамплектаваньня райсавету работнікамі, якія змогуць пастаўіць справу на належную вышыню.

Ваенкор ударнік «С. Б.»:
С. Лысенка.

Пастанова

сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб праваапартуністычным артыкуле бюлетэня БЕЛТА

1. Адзначыць, што зьмешчаны ў бюлетэне БелТА артыкул (15 кастрычніка) кожнаму калгасу—кармавы балянс» арыентуе раённы друк на раздуваньне спажывецкіх настрояў у калгасах, на складаньне дутых кармавых балянсаў, ігнаруе важнейшы абавязак калгасаў—здачы ў першую чаргу лішкаў дзяржаве.

Даны артыкул зьяўляецца праваапартуністычным дакумантам і поўнасьцю выяўляе інтарэсы кулацтва, якое перайшло да новых мэтадаў барацьбы—зрыву калгасаў знутры, процівапастаўленьня інтарэсаў паасобных калгасьнікаў, пралетарскай дзяржаве.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За зьмяшчэньне ў бюлетэні і рассылку раённым газэтам праваапартуністычнага артыкулу—**«Кожнаму калгасу—кармавы балянс»**, рэдактару бюлетэня **т. Паўлоўскаму Я. абвясьціць суровую вымову.** Для ўзмацненьня работы бюлетэня прымацаваць пазаштатнага інструктара Культпропу ЦК КП(б)Б **тав. Зоськова.** Прыняць да ведама заяву сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б аб тым, што вылучана брыгада па дэталёвым абсьледваньні работы бюлетэняй.

2. За зьмяшчэньне ў раённай газэце **«Барацьбіт за калектывізацыю»**, Плешчаніцкага раёну, вышэйадзначанага праваапартуністычнага артыкулу рэдактару газэты т. **Бутэліну** вынесьці вымову.

Указаць усім раённым газэтам, што за зьмяшчэньне ўсіх матар'ялаў у газэце рэдактар нясе поўную адказнасьць.

3. Абавязаць цэнтральны, раённы і нізавы друк больш разгарнуць асьвятленьне пытаньня загатовак і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, выдучы рашучую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі.

4. Пастанову апублікаваць у друку.

Арганізацыя працы на фэрмах, кармы!—

цэнтральная задача жывёлагадоўчых саўгасаў, калгасаў

Арганізаваць кантроль на кожным сьвінарніку, кароўніку, падлічыць кармы, устанавіць рацыён, змагацца з разбазарваньнем кармоў

Раённыя арганізацыі яшчэ не паставілі ў цэнтры ўвагі плежэсправу Рашэньне ЦК КП(б)Б і СНК павінна быць выканана.

Выходзячы з задач сацыялістычнай рэканструкцыі жывёлагадоўлі, ЦК КП(б)Б і СНК ў жніўні далі дырэктыву аб стварэньні пляменнай базы па буйнай рагатай жывёле шляхам арганізацыі сеткі плямгасаў з давядзеньнем агульнага пагалоўя ў гэтых плямгасах у 1932 годзе да 14000 галоў. Зусім зразумела, што пастаўленая партыяй і ўрадам задача па стварэньні высокапрадукцыйных таварных стад для забясьпячэньня рабочых цэнтраў малаком і малочнымі прадуктамі патрабуе максымальнай увагі да пляменнай справы, на базе якой павінна стварыцца высока-прадукцыйная жывёла.

Якія-ж перад намі стаяць задачы па ажыцьцяўленьні гэтага важнейшага рашэньня партыі і ўраду.

Па першае. Выходзячы з рашэньня ЦК КП(б)Б і СНК, неабходна шырока разгарнуць работу па стварэньні самых пляменгасаў шляхам укамплектаваньня іх пляменнай жывёлай плянавых парод. Для гэтага неабходна адпаведным сыстэмам, Райза, Райкалгас саюзам і самім плямгасам пастаўіць справу ўкамплектаваньня плямгасаў у цэнтры ўвагі.

Раённыя камісіі па ўкамплектаваньні плямгасаў пляммагар'ялам павінны правесьці сваю работу па ўдарнаму, прыняўшы ўсе захады да таго, каб камплектуемая жывёла адпавядала з якаснага боку ўсім тым запатрабаваньням, якія вымагае плямгас.

Галоўную ролю ў гэтай працы павінны адыграць вэтпрацаўнікі, на якіх ускладаецца абавязак недапусьціць у плямгасы хворай заразнымі хваробамі жывёлы.

Райза, у якіх знаходзяцца арганізуемыя плямгасы, павінны мець самую цесную сувязь з раёнамі, прымацаванымі да іх раёну з мэтай перадачы маючайся ў раёне пляменнай жывёлы плянавых парод для ўкамплектаваньня плямгасаў. Раённыя камісіі па камплектаваньні плямгасаў павінны склаць ці канкрэтныя пляны перакідкі плямжывёлы палажыўшы ў аснову даныя вучоту плямжывёлы (аб вучоце плямжывёлы ў саўгасна-калгасным сэктары была дана НКЗ дырэктыва яшчэ ў маі). Трэба памятаць, што рашэньне НКЗ—укамплектаваць да канца 1931 г. на 60 проц. плямсаўгасы іна 30 проц. плямкалгасы, павінна быць выканана.

Па другое. Неабходна скарыстаць астаўшыйся час на заканчэньне новага будаўніцтва і на прыстасаваньне старых будынкаў. Пляменная жывёла патрабуе адпаведнага памяшканьня. Для пляменнай жывёлы павінна быць прадстаўлена цёплае, сьветлае і чыстае памяшканьне.

Па трэцяе. Неабходна зараз-жа скласьці (дзе гэтакія яшчэ не складзены) кармовыя балянсы і прыняць захады да эканомнага, але ўпаўне нармальнага, выдаткаваньня кармоў, а дзе ёсьць недахоп, прыняць захады да забясьпячэньня плямкалгасаў адпаведнымі кармамі. Райза, Райкалгассаюзы і адпаведныя цэнтры, павінны ўзяць пад непасрэдны кантроль справу па выяўленьні, эканомным выдаткаваньні, забясьпячэньні плямгасаў кармамі. Пляменная жывёла павінна атрымліваць самы добраякасны корм.

Па чацьвёртае. Неабходна правільна паставіць арганізацыю працы. Зьдзель на-прэміяльная аплата працы павінна стаць асновай у працы плямгасу. Плямгас павінен быць узорным ня толькі па жывёле, але і па арганізацыі працы і асабліва ў галіне жывёлагадоўлі.

Па пятае. Шырока павінна быць праведзена работа сярод калгаснікаў па ажыцьцяўленьні зоавэтмінімуму. Каранным чынам павінны быць зьменены існуючыя барбарскія адносіны да жывёлы. Кожны рабочы плямгасу і калгаснік павінны ведаць, што жывёла патрабуе належнага догляду. Далёка горш лячыць жывёлу чым папярэдзіць хваробу. І ў гэтай справе плямгасы павінны стаць узорнымі; яны павінны служыць прыкладам для ваколічных саўгасаў і калгасаў.

Па шостае. Неабходна зараз-жа рас працаваць канкрэтны плян плямгасу на 1932 год, надаўшы асаблівую ўвагу будаўніцтву будучага году, стварэньню кармовай базы, забясьпячэньню адпаведнымі кадрамі і адпаведнаму ўтрыманьню плямжывёлы.

Справа стварэньня плямгасаў—справа ўсёй грамадзкасьці.

Толькі пры ўдзеле ўсёй грамадзкасьці і энэргічнай рабоце раённых арганізацый і саміх плямгасаў будзе выканана рашэньне партыі і ўраду.

В.

Цэнтнер сілосу—кожнай галаве жывёлы

Адозва камунараў камуны „Зьвязда“

Таварышы. Рабочыя, работніцы саўгасаў, калгаснікі і калгасьніцы! Пад няўхільным кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы дасягнулі вялізарных перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыі краіны і перабудовы сельскай гаспадаркі. Аб гэтым сьведчыць звыш 50 проц. аб'яднаных у калгасы бядняцка - серадняцкіх гаспадарак і 33 МТС на саўгасных і калгасных палёх БССР.

Партыяй і ўрадам пастаўлена задача пабудаваць у БССР буйныя фабрыкі малака і мяса, у найкарацейшы тэрмін вырашыць мясную праблему. Задача пастаўлена зусім канкрэтна: да канца 1931 году 15 тысяч сьвінамак і 78 тысяч галоў буйнае рагатай жывёлы ў калгасах БССР.

Аднак, сканчэньне будаўніцтва кароўнікаў, сьвінарнікаў і іх укамплектаваньне без стварэньня кармавых рэсурсаў не вырашае поўнага жыцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, без дастатковай наяўнасьці кармоў мы ня зможам вырашыць мясную праблему. Зусім ні сакрэт, што ў радзе месц у прыватнасьці і ў нашай камуне мы ў гэтым годзе будзем адчуваць недахоп кармоў. Заданьне партыі засіласаваць адзін мільён тон сілосу мы ня выканалі.

У радзе саўгасаў і калгасаў значная частка ня скошана атавы, зялёныя корнеплоды, лугавое сена, капуснае лісьце і іншая сіласная маса засталіся не скарыстанымі. Здарылася гэта толькі дзякуючы недаацэнцы кармавых рэсурсаў і адсутнасьці мабілізацыі ўвагі ўсёй працоўнай грамадзкасьці вёскі.

Мы добра ведаем, што здабыць зараз адну тону сілосу для нас не каштуе нічога, акрамя аднэй гадзіны баль шавіцкай працы. А тона сілосу вясной будзе для нас каштаваць значных сродкаў. Недахоп кожнага кілё сілосу ў вясну будзе зьяўляцца ўдарам па пасьляховым разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Таварышы, рабочыя, работніцы, калгаснікі і калгасьніцы. Час не чакае. Засталіся лічаныя дні і гадзіны. Скарыстаем усе магчымасьці апошніх дзён.

Сёньня мы на сваім агульным сходзе абралі штаб на правядзеньні дню сіласаваньня, вылучылі ўдарныя брыгады на канкрэтных вучастках работы. У сваёй камуне мы праводзім гэты дзень пад лёзунгам—«цэнтнер сілосу кожнай галаве жывёлы ў дзень сіласаваньня». Мы прыступілі да сіласаваньня драўлянага лісту, нясканшанай атавы і розных адкідаў гародніны.

Гэта дасьць дадаткова ў нашай камуне 100 цэнтнераў сілосу.

Таварышы! Мы заклікаем вас да супольнай барацьбы на фронце стварэньня кармавой базы. Стварайце ўдарныя брыгады. Мабілізуйце ўсе свае сілы. Штурмуйце прарыў ў сіласаваньні ў дзень суботніка імя т. Будзённага.

Змагайцеся за кожны кілёграм сілосу. Разьбівайце ўсялякія правы апортуністычнай недаацэнкі ў немагчымасьці зараз сіласаваць, узьнімайце бальшавіцкія тэмпы ў рабоце.

Усебеларускі дзень імя тав. Будзённага павінен даць дадаткова дзесяткі тысяч тон сілосу па БССР.

Памятайце, што стварэньне кармавой базы, ёсьць зарука пасьляховага разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Прэзыдыум агульнага сходу камунараў камуны «Зьвязда».

Падхапіць ініцыятыву камуны „Зьвязда“

Усім старшыням райкалгассаюзаў і праўленьняў калгасаў БССР

Заданьне партыі і ўраду засіласаваць у БССР адзін мільён тон сілосу ня выканана. Невыкананьне пляну сіласаваньня стварае пагрозу стварэньня моцнай кармавой базы і гэтым самым пагражае выкананьні праграм разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Агульны сход камунараў камуны «Зьвязда» пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх калгасаў БССР аб арганізацыі Усебеларускага дня сіласаваньня імя старшыні Усесаюзнага кармовага штабу т. Будзённага.

Падтрымліваючы пачын камунараў камуны «Зьвязда», праўленьне Белкалгасцэнтру прапануе ўсім райкалгассаюзам і праўленьням калгасаў арганізаваць дзень сіласаваньня, дабіўшыся поўнага выкананьня і перавыкананьня плянаў сіласаваньня, скарыстаўшы для гэтага няскошаную атаву, адкіды гародніны, недасьпелыя і памёрзлыя клубняплоды, гальлёвы корм і г. д.

Абмяркуе рашучую барацьбу шкодным разважаньням аб немагчымасьці зараз сіласаваць. Для пасьляховага правядзеньня дню сіласаваньня вылучыць адказных пры райкалгассаюзе і кожным калгасе, арганізуйце брыгады сілосьнікаў, прыцягнуўшы да гэтай справы ўвесь калгасны актыў.

Белкалгасцэнтр патрабуе ад усіх райкалгассаюзаў і калгасаў у правядзімы дзень па сіласаваньні поўнасьцю ліквідаваць прарыў ў выкананьні плянаў сіласаваньня і гэтым самым забясьпечыць выкананьне прынятай партыяй і ўрадам праграмы разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Нам. старшыні Белкалгасцэнтру
Стрэле.

Скарыстаць усе вопыты па сіласаваньні

Сіла аваць ня толькі яшчэ можна, але і неабходна

У барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю рашаючае значэньне мае кармавая база. Асноўным зьвяном у стварэньні моцнай кармавой базы зьяўляецца забясьпечаньне прадукцыйнай жывёлы сакавітымі кармамі.

Трэба пакуль ня позна ліквідаваць прарыў памiж колькасьцю выкананых і пабудаваных сіласных установак і загружаных ям і траншэй. У кожнай гаспадарцы магчыма захоўваць сыравіну для сіласаваньня. У некаторых калгасах і саўгасах сваячасова няўбраныя з поля коранаплоды і бульбы пашкоджаны марозам. Такія коранаплоды нельга захоўваць, бо яны хутка папсуюцца, сіласуючы-ж атрым ліваецца добраякасны сакавіты корм, які магчыма захоўваць да канца зімы. Гуменныя адходы—мякіна, салома таксама зьяўляецца добрым матар'ялам для сіласаваньня. У сіласаваным выглядзе гуменныя адходы і салома добра паядаюцца жывёлай і спажыўная якасьць іх пры сіласаваньні паляпшаецца. Асабліва добраякасны сілос з гуменных адходаў магчыма атрымаць пры сіласаваньні з бардой і мязгой крухмальных заводаў. У тых гаспадарках, дзе няма барды і мязгі, гуменныя адходы і салому магчыма засіласаваць з вадой.

Тэхніка сіласаваньня наступная: салома рэжацца на сячкарні і добра перамешваецца ў вялікіх кадушках з вадой, а пасьля скідаецца ў яму, або траншэю і добра трамбуецца. Сечку можна паліваць вадой і перамешваць непасрэдна ў ямах, лепш для падлукі вадой карыстацца пажарным шлангам; неабходна сачыць за тым, каб вада добра ўбралася верхнімі пластамі саломы, а не прыляжала на дно. Ва ды трэба браць прыблізна 2 пуды на адзін пуд саломы. Трамбаваць сілосную салому трэба вельмі добра. Пры трамбоўцы трэба дабіцца таго, каб як магна менш засталося ў сілосной масе паветра, бо яно спрыяе воцатнакіслому брашаваньню, што псуе корм. Груз - пакрышку трэба рабіць больш мацнейшым, чым пры сіласаваньні зялёнай масы. Сіласаваньне гуменных адходаў нічым не адрозьніваецца ад сіласаваньня саломы.

У саўгасах і калгасах навакол броварэй і крухмальных заводаў трэба зараз-жа арганізаваць сіласаваньне барды і мязгі. Сіласаваць барду і мязгу трэба толькі сывежую. Мязга зьяўляецца вельмі вадзяністым прадуктам для сіласаваньня, утрымлівае 90—95 проц. вады, а для атрыманьня добрага сілосу, трэба, каб сілосуемая маса мела процант вільгаці ня вышэй 70—79 проц. Таму да мязгі трэба прыбаўляць сухога корму саломы, ці гумянных адходаў. Пры сіласаваньні барды і мязгі трэба ў ямах і траншэях з воданепрапускаемымі сьценкамі і дном рабіць аблідоўку ям і траншэй дошкамі або іншым матар'ялам. Для зьмяншэньня вільгаці ў мязьзе трэба прымешваць салому і гуменныя адходы. Салома рэжацца ў сячкарні і ў яме або траншэі замешваецца з мязгой. Саломы бярэцца 5—10 пр. ад вагі сілосуемай мязгі, альбо, што прасьцей, на кожны пласт мязгі таўшчынёю ў 15—20 см. бярэцца пласт саломы, таўшчынёю ў 5 см. пры загрузцы мязгі з саломай масу трэба добра ўтрам боўваць. Пакрышка сіласнай ямы робіцца звычайная.

Падмарожаныя коранаплоды і бульбу трэба сіласаваць такім чынам: пад марожаныя коранаплоды папярэдне адтаяць, ачысьціць ад гнілых каранёў і добра памыць; прамытыя коранаплоды рэжуцца на часткі на коранарэзках, якія ставяцца так, каб рэзаная маса непасрэдна трапіла ў яму, альбо траншэю. Тым калгасам, якія ня маюць уласных коранарэзак, трэба пазычыць іх у бліжэйшым саўгасе. Коранаплоды зьмяльчаць лапатамі непасрэдна ў ямах. Рэзаныя коранаплоды раўнамерна разроўнваюцца па яме і добра ўтрамбоўваюцца. Асабліва трэба добра ўтрамбоўваць коранаплоды каля сьцен і па кутох ямы, альбо траншэі. Чым менш астаецца паветра ў сілоснай масе, тым лепшы атрымаем сілос. Для зьмяншэньня вільгаці ў сілосных коранаплодах трэба дадаць да іх сечкі, альбо гуменных адходаў у колькасьці 5—10 пр. ад вагі сілосуемай масы, або на кожны пласт коранаплодаў таўшчынёю ў 15—20 см. класьці салому ў 5 см. Укрыцьцё сілосу робіцца так, як і пры сіласаваньні зялёнай травяной масы.

Засіласаваныя коранаплоды праз 3—4 дні магчыма скормліваць жывёле. Сіласныя ўстаноўкі для сіласаваньня коранаплодаў павінны адпавядаць усім тым запатрабаваньням, якія прад'яўляюцца і для сіласаваньня зялёнай масы, мець досыць шчыльныя сьцены і дно, не прапушчаць ваду і паветра. Калі-ж грунт пяшчаны, альбо супяшчаны, дык трэба рабіць аблідоўку.

Трэба скарыстаць усе магчымасьці для таго, каб выканаць плян па сіласаваньні і гэтым забясьпечыць сацыялістычную жывёлагадоўлю добраякасным сакавітым кармом.

Ніводнага калгасу і саўгасу з дэфіцытным кармавым балянсам.

А. Вальчэ.

Для адчыненьня рабочага падрыхтоўчага аддзяленя на асьпірантуры БАН

Адчыненьне рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня асьпірантуры пры Беларускай Акадэміі Навук буйная падзея ў гісторыі Акадэміі. Гэтым самым Акадэмія зрабіла яшчэ адзін крок у справе ўмацаваньня сувязі з шырокімі рабочымі масамі, без чаго немагчыма далейшае разьвіцьцё Акадэміі. Толькі падрыхтаваўшы пралетарскія навуковыя кадры (што, зразумела, ні ў якой меры ня выключае беражлівага, ўмелага скарыстаньня старых навуковых работнікаў) мы ў поўнай меры здолеем аўладаць навукай, пастаўшы яе на службу сацыялізму.

За гады рэвалюцыі навукова-дасьледчая думка БССР можа ганарыцца вялікімі дасягненьнямі. Аднак, наяўнасьць навуковых кадраў яшчэ незадастаткова, каб пасьпяхова выконваць стаячыя перад намі задачы. Недахват навуковых сіл усё зараз адчуваецца амаль ва ўсіх галінах ведаў. Арганізацыяй першага рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня, мы толькі частковa вырашаем задачу падрыхтоўкі неабходных нам літаральна тысяч навуковых сіл, якіх патрабуе новая пяцігодка. Вось чаму сьледам за першым наборам мы павінны ўжо думаць аб наборы для навуковай работы новых сотняў лепшых прадстаўнікоў рабочых мас, бо калі мы сваячасова ня прымем неабходных мер па падрыхтоўцы новых навуковых кадраў, мы гэтым самым паставім пад пагрозу пасьпяховае выкананьне нашай наступнай пяцігодкі, у працягу якой мы павінны цалкам электрыфікаваць нашу рэспубліку, перавесьці на мэханічную цягу нашу сельскую гаспадарку, пакрыць нашу краіну магутнымі гігантамі - заводамі, здолець скарыстаць нашы неасяжныя залежы торфу, узьвяць ураджайнасьць нашай сельскай гаспадаркі, дабіцца шляхам сэлекцыйнай работы атрыманьня новых сельска - гаспадарчых культур і г. д. Падрыхтоўкай навуковых кадраў, патрэбных для будучай пяцігодкі трэба заняцца іменна зараз, паколькі для падрыхтоўкі навуковага работніка патрабуецца доўгі тэрмін.

Арганізацыяй першага рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня Акадэміі гэты тэрмін скарачае. Ня прыходзіцца паказваць якія, у сувязі з гэтым, адказныя задачы стаяць перад слухачамі першага рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня. Ад іх патрабуецца ўдарная работа. Інакш мы не абгонім навуковую думку заграніцы. Як вядома ўжо зараз, напрыклад, з пабудовай адзінай ўсесаюзнай высокавольтнай сеткі паўсталі рад новых праблем, якіх нават ня ставіла зарубежная навуковая думка. Новыя-ж пытаньні ўзьнімаюцца і ў іншых галінах грамадзкіх і прыродазнаўчых навук. Разьвязаць іх мы зможам толькі няўхіла на памятаючы, што савецкая навука павінна быць вышэй за буржуазную, пры мы ні на хвіліну не павінны забываць пра якасьць нашай навуковай прадукцыі. Выканаць-жа гэтыя задачы мы зможам толькі працуючы па ўдарнаму, рацыянальна скарыстаўшы наш час (які, нажаль, часта цэніцца таньней за ўсё).

Тав. Сталін аднойчы правільна заўважыў, што сталь ленінізму зьяўляецца з злучэньні рускага рэвалюцыйнага размаху і амэрыканскай дзелавітасьці. Нашы навуковыя кадры павінны даваць узоры бальшавіцкага ўменьня работы. Камплектаваньне нашых кадраў з асяродку пралетарыяту забясьпечвае новы тып вучонага, злучаючага ў сабе самаахвярнага рэвалюцыянэра-камуніста і буйнага спэцыяліста.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўжо выкавана не адна сотня такіх бальшавіцкіх вучоных. Наш набор рабочага падрыхтоўчага аддзяленьня павінен будзе папоўніць іх рады.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук **П. ГОРЫН.**

СКАРАЦІЦЬ ПРАСТОІ—ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ РАМОНТУ

На ст. Локня за другую дэкаду кастрычніка 75 вагонаў прастаялі 2.060 гадзін. На Полацкім чыгуначным вузьле дрэнная якасьць рамонту паравозаў і вагонаў

„Павінна быць забясьпечана рашучая барацьба за беражлівае скарыстаньне транспартных сродкаў, вагонаў і паравозаў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад пагрузкай і выгрузкай“ (З пасг. Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)

Полацкі чыгуначны вузел не перабудаваў сваёй работы

Полацак. (Белта). Полацкі чыгуначны вузел не перабудаваў сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі асеньня-зімовых перавозак і загадам Наркома т. Андрэева. Ніякай падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак ня было, а наадварот, было скарочана рабочая кваліфікаваная сіла. Сакратар базавай ячэйкі КП(б)Б Антараў проста заявіў: «У нас было дастаткова раней кваліфікаваній сілы і мы 12 рабочых скарацілі, мы-ж ня маглі прадугледзець, што ў час асеньня-зімовых перавозак патрэбна будзе кваліфікаваная сіла».

Пачынаючы з 10-га па 23 кастрычніка было зрыў двух дзесяткаў спазьненьняў цягнікоў. За гэтыя 13 дзён ня выдана па раскладу 8 паравозаў для цягнікоў і адпраўлена не згодна раскладу 8 цягнікаў, з якіх 6 цягнікаў адпраўлена не па раскладу, а выключна па віне дыспэтчарскага апарату.

Такія зьявішчы з кожным днём павялічваюцца. Калі камсамольская арганізацыя вышла на штурм па рамонту паравоза, дык аказалася, што дыспэтчэр, ня ведаў дзе ён стаіць.

Шэсьць умсў т. Сталіна ў рабоце чыгункі ня знашлі свайго адбітку. Па ранейшаму зрываецца спараная язда, качагары не прымацаваны да паравозаў, бязглуздая нераазмяркаванасьць наглядаецца па ўсіх галінах работы чыгуначнага вузла.

Загад т. Андрэева таксама не знайшоў патрэбнага адбітку

Перавесьці ашчадкасы на САПРАЎДНЫ ГАСПАДАРЧЫ разьлік

ПРАЛЕТАРСКАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ПАВІННА ЎЗЯЦЬ ПАД СВОЙ ЖОРСТКІ КАНТРОЛЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) і СНК СССР АБ НОВЫХ ПРЫНЦЫПАХ КРЭДЫТАВАНЬНЯ Ў СЫСТЭМЕ АШЧАДКАСЫ

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР па дакладу тав. Захаравай аб рабоце кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыту і выкананьні дырэктыў па ўзмацненьні ашчадсправы ў БССР

Сыстэма ашчадкас БССР дала на працягу 1931 г. павялічэньне ўкладаў на 2.647,2 тыс. руб., астача укладаў дасягае па БССР на 1-X—агульная сумы ў 21.056,5 т. р., у тым ліку **фізычных укладаў** 14.469 т. р., значна павялічылася клієнтура ашчадкас, пры чым лік **укладчыкаў** (па даных на 1-VIII) вырас на 158,058 і складае на 1-VIII па БССР 599 тыс. 755 укладчыкаў. **Сетка ашчадкас** пашырылася на 401 адзінку і складае на 1-X 1547 ашчадкас, з іх 1104 на вёсцы.

Побач з гэтым Калегія НКФ БССР канстатуе, шэраг **сур'ёзных прарываў** у сыстэме ашчадкас па асноўных паказчыках:

Заданьне 1931 г. па фізычных укладах выканана на 1-X у разьмерах 31 проц., пры чым у 3-м квартале прыліў укладаў складае толькі 12,8 проц. квартальнага заданьня. У галіне пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» **рэалізацыя** выражаецца ўсяго у 94,2 проц. заданьня па БССР. Пры гэтым **заданьне сярод калгасьнікаў** невыкана на поўнасьцю (97,7 проц.), а па **адна-асобніках—29,4 проц.** Значнае **адставаньне** маецца ў галіне афармленьня пазыкі: на 1-X па групе рабочых і **служачых афармлена** ўзносамі 92,6 проц., па **калгасьніках**—51,2 проц. У лік заяўленай **адна-асобнікамі** падпіскі прашовыя паступленьні складаюць толькі 62 проц.

Нездавальняючыя вынікі маюцца і па іншых галінах працы ашчадкас: план асабовага страхаваньня (па зьвестках 52-х раёнаў) выкананы ўсяго на 55 проц., слаба разьвіваюцца безнаяўныя разьлікі па масавых плацяжох на сельніцтва.

Пры слабым выкананьні пляну **папырэньня сеткі ашчадкас** (50,6 пр.) амаль палова адчыненых ашчадкас вяўляцца касамі **ніжэйшага тыпу, касавым** абслугоўваньнем ахоплена ўсяго 150 бюджэтаў с-саветаў.

Вынікам прарываў у выкананьні заданьняў ашчадкас зьяўляецца вельмі высокі кошт апэрацый і апарату.

Першыя 2 дэкады кастрычніка пры некаторым **падпіманьні** ў галіне **рэалізацыі** пазыкі (па калгасьніках 99,3, па адна-асобніках 32,6 проц.) і **афармленьне** падпіскі (91,7 проц. па БССР) 96,8—па горадзе і 61,4—па сельскаму сэктару), у галіне ўкладаў нішкага **пералому** не дасягнута, а наадварот маецца нават **адліў** ў суме 83 т. р.

Асноўнымі прычынамі прарыву зьяўляюцца:

а) слабасьць ашчаднага апарату і яго асноўнага зьвяна райашчадкас, не стаўшых яшчэ ў большасьці раёнаў арганізатарамі ашчаднай справы і дзяржкрэдыту.

б) Вельмі **нездавальняючае** становішча **з кадрамі** ў сыстэме ашчадкас: неадпаведнасьць свайму прызначэньню значнай часткі загадчыкаў райкас, (у 4-х раёнах загадчыкаў зусім няма) і інспэктарскі оклад у большасьці ня мае вопыту і належнай падрыхтоўкі, пры чым у 13 раёнах пасады інспэктароў зусім не замешчаны. У 8 райашчад касах адсутнічаюць бухгальтары, а амаль у палове раёнаў бухгальтары падлягаюць замене.

Якасьць падрыхтоўкі выпушчаных курсантаў **нездавальняючая**, пры чым кантынгент набору на свайму ўзросту і агульнаму разьвіцьцю ў большасьці **недабраякасны.** Гэта зьяўляецца пры чынай **нізкай кваліфікацыі** большасьці працаўнікоў, як райашчадкас так асабліва сельскіх.

в) Адсутнасьць **сыстэматычнай масавай працы** па ашчадсправе і слабая ўвязка яе з агульнай культ-масавай працай праводзімай сярод працоўнага насельніцтва ў горадзе і на вёсцы, а таксама праца большасьці ашчадкас **на самацёк.**

г) **Нездавальняючае абслугоўваньне** ашчадкасамі працоўных мас укладчыкаў, несвячасовае выкананьне даручэньняў кліентуры, наяўнасьць фактаў бюрократызму, і цяганіны ў асобных касах.

Разам з гэтым калегія адзначае наступнае недахопы ў працы. Кіраўніцтва АК і ДК: адсутнасьць **дыфэрэнцыраванага** кіраваньня раёнамі і ручноту, слабы нагляд **за выкананьнем на месцах** дырэктыў партыйных, савецкіх органаў і самога кіраўніцтва. Асабліва падкрэсьліць слабае выкананьне ў БССР пастаноў СНК СССР ад 1-II і СНК БССР ад 3-III і пастановы аб'яднанай Калегіі НКФ, і НКПіТ па пытаньні працы паштовых ашчадкас.

Адначасова Калегія канстатуе, што адсутнасьць нагляду з боку большасьці саветаў за працай ашчадкас і практычнай дапамогі ім, шматлікія факты **мабілізацыі работнікаў** ашчадкас на інш. кампаніі (Жыткавічы, Смалявічы, Карма, Краснапольле, Лельчыцы, Крупкі і інш.) адмоўна адбіваюцца на працы ашчадкас.

У мэтах рашучай перабудовы і актывізацыі працы ашчадкас як важнейшага фактару фінпляну ператварэньня ашчадкас у сапраўдную масавую крэдытную арганізацыю і забясьпячэньня поўнага выкананьня плянаў Калегія НКФ пастанаўляе:

1) Кіраўніцтву Ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту:

а) прыняць самыя рашучыя захады да ўзмацненьня і палепшаньня працы ўсёй сыстэмы ашчадкас і ліквідацыі адзначаных прарываў у месячны тэрмін.

б) Палепшыць кіраваньне раёнамі і перайсьці ў двухдэкадны тэрмін на сыстэму **дыфэрэнцыраванага** кіраваньня пэрыферыяй, увязаўшы канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне з Арг. Інспэктарскім сэктарам.

в) Узмацніць жывую сувязь і інструктаж раёнаў, асабліва адстаючых, прыняўшы захады да ўмацаваньня складу інспэктароў і падняцьця іх кваліфікацыі.

г) Устанавіць дакладны вучот ходу працы ў асобных раёнах і гарадох, стала вывучаючы ўжытаньня на месцах формы і мэтады працы, з мэтай перанясеньня лепшых прыкладаў на іншыя раёны.

2. Рашуча ўзмацніць **агіт-масавую працу па ашчадсправе**, устанавіўшы штодзённую сувязь з прафсаюзнымі, камсамольскімі і добраахвотнымі арганізацыямі, і ўвязваць сваю працу з усімі **правадзімымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі**, і мерапрыемствамі.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на палепшаньне інструктажу камсоду і грамадзкіх інструктароў з боку райфа і ашчадкас і ажыцьцяўленьне іх працы, а таксама стварэньне вакол ашчадкас **сталага грамадзкага актыву.**

3. Абавязаць кіраўніцтва Ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР, загадчыкаў райфа і райашчадкас ужыць рэальныя меры да палепшаньня абслугоўваньня ўкладчыкаў і пазыкатрымальнікаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на спрашчэньне працы і рацыяналізацыі тэхнікі.

Арганізаваць да 1-I—1932 г. **паказальныя касы** абавязкова ў кожным раёне і буйных гарадзкіх цэнтрах, дабіўшыся прыкладаній пастаноўкі працы і абслугоўваньня працоўных у гэтых касах і распаўсюджваньня іх вопыту на іншыя раёны.

Кіраўніцтву АК і ДК у дэкадны тэрмін даць паказаньні мясцом аб вопытных касах.

4) Улічваючы важнае значэньне мак сымальнага прыбліжэньня ашчадкас да працоўнага насельніцтва, Кіраўніцтву АК і ДК і загадчыкам райфа ў дэкадны тэрмін прыняць усе захады да выкананьня пляну разгортваньня сеткі на 1931 год.

Разгарнуць працу па ахопе **сэзонных рабочых, лесараспрацовак і інш.**, арганізуючы на буйных сэзонных работах ашчадныя касы і прымацоўваючы больш дробныя сэзонныя работы да бліжэйшых ашчадкас.

Пры разгортваньні сеткі ашчадкас зьвярнуць асаблівую ўвагу на адчыненьне ашчадкас на сацыялістычным сэктары вёскі, зрабіўшы іх апорнымі пунктамі ва ўсёй працы на вёсцы. На працягу IV кварталу арганізаваць ня менш **10 паказальных ашчадкас** у буйных калгасах, звыш пляну.

Побач з мерапрыемствамі па разгортваньні сеткі прыняць захады да актывізацыі і падняцьця рэнтабельнасьці існуючай сеткі і забясьпечыць да 1-I—32 г. арганізацыю касавага абслугоўваньня ня менш адной трэці сельскіх бюджэтаў.

6. Прасіць **Белкалгасцэнтр** прыняць рэальныя захады да забясьпечаньня спрыяючых умоў для працы ашчадкас у калгасах, сыстэматычна правяраючы выкананьне дадзеных у галіне ашчадсправы і дзяржкрэдыту па калгасным сыстэме дырэктыў.

6. Зьвярнуць увагу Беларускага Кіраўніцтва Сувязі на недастаткова актыўную працу большасьці ашчадкас **пры паштовых установах** з просьбай прыняць захады да арганізацыі пры усіх паштовых установах ашчадных кас і палепшаньня працы ўсіх існуючых ашчадкас. Лічыць неабходным у дакладзе Начальн. Беларускага Кіраўніцтва Сувязі аб мерапрыемствах па разьвіцьці ашчадсправы.

7. Улічваючы вялізарнае значэньне правадзімай па БССР фінэстафэты, абавязаць кіраўніцтва АК і ДК заразжа праверыць выкананьне сыстэмай ашчадкас дадзеных дырэктыў і паказаньняў.

Даручыць кіраўніцтву АК і ДК вывучыць вопыт праведзімай эстафэты і накладзіць у райкасах поўны вучот усіх мерапрыемстваў з тым, каб забясьпечыць **іх арганізацыйнае замацаваньне.**

8. Сэктару Кадраў персанальна тав. **Варушыла** ў дэкадны тэрмін пераглядзець існуючую сетку курсаў і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы патрэбных для сыстэмы ашчадкас пра цаўнікоў, і прадставіць спецыяльны даклад па гэтаму пытаньню. Дабіцца без адкладнага аварону на ашчадную працу ўсіх асоб скончыўшых у гэтым годзе курсы па ашчадсправе.

9. Перавесьці не пазьней 1-I—32 г. Гор-райашчадкасы на сапраўдны **гаспадарчы разьлік**, а таксама перавесьці частку апарату Кіраўніцтва АК і ДК праца якой падаецца вучоту на зьдзельную аплату.

Абавязаць т. **Захараву** ў месячны тэрмін падаць на зацьверджаньне Калегіі дакладна распарадкаваны праект мерапрыемстваў па ўвядзеньню ў сыстэме ашчадкас гаспадарчага разьліку.

10. Улічваючы адставаньне ставак работнікаў сыстэмы ашчадкас ад ставак іншых фінансава-крэдытных установаў і з мэтай палепшаньня матар'яльных умоў і барацьбы з цякучасьцю ў ашчадным апараце лічыць неабходным падняць існуючыя стаўкі. Даручыць т. Захаравай у пяцідзённы тэрмін падаць на зацьверджаньне Наркому Фінансаў і Наркампрацы праект дыфэрэнцыраваных ставак работнікам ашчадапарату як цэнтральнага, так і нізавога.

Адначасова узьняць пытаньне перад адпаведнымі органамі аб палепшаньні матарыяльна - бытавых умоў працаўнікоў сыстэмы ашчадкас.

11. Даручыць Кіраўніцтву АК і ДК у двухдэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтны план шырокага масавага паходу за ашчадсправу у БССР па прыкладу іншых Саюзных Рэспублік.

12. Абавязаць Сэктар выкананьня персанальна тав. Лонскага устанавіць спецыяльны нагляд за выкананьнем гэтай і іншых дырэктыў і пастаноў па ўзмацненьні ашчадсправы ў БССР.

Народны Камісар Фінансаў БССР
І. Хацкевіч.

25-X—1931 г.

Увесьці сапраўдны гаспадарчы разьлік у ашчадапаратах

Адным з адмоўных момантаў у рабоце сыстэмы ашчадкас, зьяўляецца існуючая ў ашчадных касах сыстэма арганізацыі і аплаты працы работнікаў апарату (ўраўнілаўка і абязьлічка).

Таму перавод ашчадапарату на сапраўдны гаспадарчы разьлік, увядзеньне сыстэмы прэм'яльна-заахвочаючай аплаты павінны зьявіцца стымулам да інтэнсыўнасьці і прадукцыйнасьці ў рабоце работнікаў апарату.

Для практычнага ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў павінны быць распрацаваны адпаведныя палажэньні, у якіх падрабязна паказаць аб'ём і разьмеры работ кожнае часткі апарату ашчадкасы і пасобных работнікаў, тэрмін і колькасьць часу для выкананьня работ, норма нагрузкі і формы вучоту выпрацоўкі. Гэта пытаньне разглядалася на ўсесаюзнай нарадзе работнікаў ашчадкас і па атрыманьні канкрэтных пказаньняў кіраўніцтва АК і ДК БССР прыступіць да практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў нарады і Калегіі НКФ СССР.

У пачатку кастрычніка г. г. работнікам Гомельскай ашчаднай касы т. Юдашкіным быў унесены проект аб пераводзе на прэм'яльную сыстэму аплаты работнікаў кантролю ашчаднай касы, гэта ініцыятыва нізавога работніка ў кіраўніцтве ашчаднай касы і дзяржаўнай касы была ўхвалена. Кіраўніцтва АД і ДК прэм'явала т. Юдашкіна за распрацованы ім праект, які паслужыць матар'ялам да пераводу часткі работнікаў ашчадкас на прэм'яльна-зьдзельную аплату.

Работнікі ашчаднага апарату, ведаючы аб прарывах у сваёй рабоце, павінны прыняць усе захады да яе палепшаньня і шляхам унясеньня канкрэтных рацыяналізатарскіх прапаноў зьнішчыць маючыяся недахопы.

Прафсаюзныя арганізацыі—ЦП Саюзу фін. банкаўскіх работнікаў і яго нізавыя ячэйкі, МК НКФіну і Кіраўніцтва ДК і АК і ўся грамадзкасьць павінны прыняць актыўнейшы ўдзел ў гэтай справе.

Г. Д.

За ўдарную работу ў выкананьні фінпляну прэм'яваны

Мабілізацыя сродкаў па Шклоўскім, Славенскім і Мікіцінскім сельсаветах пастаўлена на належную вышыню. Сельсаветы па сапраўднаму вядуць барацьбу за сваячоснае і поўнае выкананьне фінпляну. Шклоўскі сельсавет па зборы сельгаспадатку на 23 кастрычніка выканаў плян на 90 проц. Амаль такое-ж становішча і па іншых абавязковых і не абавязковых пляжох. У першых радох мабілізацыі сродкаў таксама ідуць Славенскі і Мікіцінскі сельсаветы.

Пастановай прэзыдыуму РВК вышэй памянёных сельсаветаў прэм'яваны, Старшыня Шклоўскага **сельсавету** тав. Пёчуноў у 100 р. і сакратар у 71 руб. Астатнія старшыні сельсаветаў прэм'яваны на 75 руб.,

Другім сельсаветам Шклоўсакага раёну патрэбна ўзяць прыклад з перадавых і заваяваць перамогу на фінансавым фронце.

Р. Баравік.

Рудзенскі сельсавет узварушыўся

Пасьля сыгналаў «Савецкай Беларусі» Рудзенскі сельсавет Пухавіцкага раёну, мабілізаваў усе свае сілы і грамадзкасьць сельсавету на выкананьне фінпляну. Гадавое заданьне па падатку выканана на 72 проц., па страхоўцы—76 проц.

Аднак, кепска справа з рэалізацыяй пазыкі «Трэцяга рашаючага году». Заданьне 9.000 руб. выканана на 16 пр., рэалізавана толькі на 1.580 руб.

Рыг. Асака.

Хойніцкі раён павінен узяць на буксір Рэчыцкі раён

Наркамфін БССР т. **Хацкевіч** учора паслаў Хойніцкаму і Рэчыцкаму раёнам наступныя тэлеграмы: **Рэчыца, Райком КП(б)Б т. Мазуру** «План мабілізацыі сродкаў кастрычніка па вашым раёне правалены. Даручана Хойніцкаму раёну ўзяць Рэчыцу на буксір. Прашу аказаць садзейнічаньне».

Хойніцкаму райфа. «Адзначаючы посьпех выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў па в-раёне 103 проц. Прашу раённыя арганізацыі ўзяць на буксір Рэчыцкі раён, чакаю адказу».

Ніводна а пэнтнера збожжа прыватніку

Поўнасьцю выканаць пляны збожжазагатовак

Мацней удар па кулаку, па рвачох, па дэзарганізатарах збожжазагатовак

Выкананьне гадавога пляну

На 20 кастрычніка	На 25 кастрычніка	На 1 лістапада
36,6 проц.	38,8 проц.	41,1 проц.

ЗВОДКА аб ходзе збожжазагатовак па БССР на 31 кастрычніка

	У %% да гадавога пляну
По сыстэме Белкаапсаюзу	
Аршанскі	55,8
Асьвейскі	100,1
Бабруйскі	59,0
Бешанковіцкі	51,8
Бялынецкі	49,0
Віцебскі	52,5
Вушацкі	47,6
Гарадокскі	54,1
Гомельскі	104,7
Горацкі	64,6
Дубровенскі	67,0
Койданаўскі	24,4
Крупскі	30,5
Лёзьнянскі	42,8
Магілеўскі	41,7
Менскі	33,4
Мсьціслаўскі	63,8
Полацкі	47,6
Расонскі	58,0
Сеньненскі	58,8
Сіроцінскі	54,1
Сураскі	95,1
Талачынскі	56,6
Чавускі	38,4
Чашніцкі	26,0
Шклоўскі	49,4

По сыстэме Белкаапсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 49,9 проц.

По сыстэме Белхлебжывсаюзу	
Асіпавіцкі	26,0
Барысаўскі	39,6
Брагінскі	35,7
Буда-Кашалёўскі	35,5
Быхаўскі	39,1
Бягомльскі	45,5
Бярэзінскі	40,7
Веткаўскі	49,2
Узьдзенскі	28,2
Глускі	32,2
Жлобінскі	45,7
Жыткавіцкі	37,0
Заслаўскі	49,4
Камарынскі	29,5
Капыльск	34,7
Карасінскі	45,3
Кармянскі	48,8
Касьцюковіцкі	44,8
Клімавіцкі	35,2
Клічаўскі	24,2
Крычаўскі	51,5
Лагойскі	43,3
Лельчыцкі	26,6
Лоеўскі	44,6
Любаньскі	28,0
Мазырскі	34,0
Нараўлянскі	67,6
Парыцкі	54,9
Плешчаніцкі	48,1
Прапойскі	32,3
Пухавіцкі	32,1
Петрыкаўскі	17,4
Рагачоўскі	36,8
Рэчыцкі	30,2
Слуцкі	23,4
Смалявіцкі	40,1
Стара-Дарожскі	16,2
Старобінскі	33,6
Тураўскі	19,8
Уваравіцкі	76,2
Хойніцкі	42,1
Церахаўскі	56,6
Чачэрскі	36,1
Чырвонапольскі	45,2
Чырв. Слабод.	38,5
Чэрвеньскі	28,0
Чэрыкаўскі	50,0

По сыстэме Белхлебжывсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 37,7 проц.

У яго па БССР плян збожжазагатовак на 31 кастрычніка выкананы на 41,1 пр.

Інструктар Райкалгассаюзу Жыдовіч--чалавек з „добрым сэрцам"

Ніводзін з калгасаў Чэрвенскага раёну яшчэ ня выканаў пляну збожжазагатовак. Ёсьць выпадкі калі асобныя калгасы замест таго, каб у першую чаргу выканаць свае абавязкі па здачы лішкаў збожжа дзяржаве, разьмяркоўваюць збожжа сярод калгасьнікаў. Так зрабілі калгасы імя «Энгельса» і «Чырвоная Малінаўка». Праўленьні гэтых калгасаў імкнуцца давесьці, што дадзенае ім заданьне па збожжазагатоўках не рэальнае.

Чэрвеньскі райкалгассаюз ня прымае ніякіх захадаў да таго, каб гэтыя калгасы выканалі пляны збожжазагатовак і каб ліквідаваць кулацкія настроі праўленьняў. Інструктары райкалгассаюзу, якія пасланы ў калгасы па праўленьні збожжазагатовак, амаль нічога там ня робяць.

Наадварот, былі выпадкі калі асобныя інструктары проста зрывалі збожжазагатоўкі. Так, інструктар **Жыдовіч** у калгасе **«Чырвоная Малінаўка»** адкрыта заявіў: «Вы пляну ня выкопвайце, бо вам самім потым ня хопіць хлеба. Лепш вы складзеце акт аб нерэальнасьці заданьня і прышлеце гэты акт у Райкалгассаюз».

Мала гэтага, Жыдовіч вылучыў з калгасу цэлую делегацыю і паслаў яе ў Чэрвень для хадайнічаньня аб зьнятьні заданьня.

Такія факты меліся яшчэ і ў некаторых іншых калгасах.

Неабходна зараз-жа прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыкаў збожжазагатовак у Чэрвеньскім раёне.

Сайкоў.

Бульбу—пралетарскім пэнтрам

Штурмаваць прарывы

ў выкананьні пляну адгрузкі бульбы

Поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць перад ленінградзкім пралетарыятам

Прэміі лепшым па загатоўцы бульбы

МЕНСК. 3-XI. (Белта). За датэрміновае выкананьне асобнымі раёнамі заданьня па адгрузцы бульбы Ленінграду, калегія Наркамнабу пастанавіла прэм'яваць наступныя раёны: **Бабруйскі, Магілеўскі, Касьцюковіцкі і Талачынскі па 1500 руб. кожны і Клімавіцкі, Бярэзінскі і Сеньненскі па 1000 руб.** Грашовыя прэміі будуць перададзены ў распараджэньне райвыканкомаў для прэм'яваньня лепшых сельсаветаў, партыйных і камсамольскіх вязек, калгасаў і асобных працаўнікоў каапэрацыі, чырвон., газэт, школ і прафсаюзаў, якія прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі адгрузкі.

За пасьпяховае выкананьне ў IV квартале жывёлазагатовак і загатовак бульбы выдзелены 2000 руб. для прэм'яваньня асобных сельсаветаў, калгасаў і працаўнікоў.

Адзначаючы арганізуючую ролю ЛКСМБ у барацьбе за бальшэйшае выкананьне заданьняў партыі і ўраду па загатоўцы бульбы, калегія Наркам снабу прэм'явала: **Аршанскі райком ЛКСМБ—800 руб., калектыў ЛКСМБ службы цягі ст. Ворша—500 руб., Магілеўскі райком ЛКСМБ—800 руб. і Клімавіцкі райком ЛКСМБ—500 руб.**

Для прэм'яваньня лепшых ударнікаў калгасьнікаў калгасаў: «Камуна», «Камінтэрн» і імя 9 студзеня адпушчана па 300 руб. на кожны з гэтых калгасаў.

Рвачы тармозяць выкананьне пляну адгрузкі бульбы

Рагачоўскі раён злачынна адстае ў выкананьні пляну адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам. На 1 лістапада раёнам заданьне па адгрузцы бульбы выкананы ўсяго на 60 проц.

Значная частка сельсаветаў і праўленьняў калгасаў у праведзеньні кампаніі адгрузкі бульбы бязьдзейнічаюць. Некаторыя праўленьні калгасаў ахоплены кулацкімі, месьніцкімі настроямі. Замест ударнага выкананьня пляну адгрузкі бульбы ў гэтых калгасах у першую чаргу ствараюцца розныя фонды ўнутранога спажываньня бульбы, прычым нормы у гэтых фондах значна перавышаюць сапраўдныя патрэбы.

У калгасе **«Наша воля»**, Асаўніцкага сельсавету, кулакі **Скрыгалоў і Бабіч**, якія пралезьлі ў праўленьне, лепшую бульбу разьмеркавалі паміж калгасьнікамі, а горшую адалі па загатоўках. У калгасе **«Чырвоны Молат»** выкананая бульба да 1 лістапада яшчэ ня была зьвезена **з поля. Гэтую** бульбу калгасьнікі бралі сабе ды уся кага вучоту.

На гэтай злачыннай бязьдзейнасьці райкалгассаюз паспен рашуча ўдарыць. Бязьлітасны адпор павінны атрымаць і рвацкія тэндэнцыі праўленьня калгасу «Наша воля».

Ян Клімовіч.

ТАМ, ДЗЕ ЗРЫВАЕЦЦА АДГРУЗКА БУЛЬБЫ

Крупскі раён марудна адгружае бульбу Ленінграду. Плян адгрузкі на 25-X выкананы усяго на 40 проц. Іпрушацкі і Нацкі сельсаветы выканалі плян—першы на 19 проц., а другі—на 32 проц. Паступленьне цывёрдых заданьняў па бульбазагатоўках з кулацка-заможных гаспадарак праходзіць камацёкам. На Нацкім сельсавеце цывёрдыя заданьні выкананы ўсяго на 1,8 проц. Раённыя арганізацыі слаба кіруюць ходам кампаніі загатовак і адгрузкі абульбы.

А. Вясковы.

Калачоўскае сельспажыўтаварыства, Лагойскага раёну, непадрыхтавана сустрэла загатоўчую кампанію. Калачоўскія «каапэратары» нават не пакланаціліся аб тым, каб забясьпечыць здатчыкаў загатовак котлаззю. Між тым коламазі ў раённай базе ёсьць шмат, але яе ня прывезьлі ў краму. У выніку гэтага загатоўцам прышлося адвозіць прадукты, якія зда валіся па загатоўках, на вямазных колах.

Я. Дубок.

Аказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Пачатак а 7, 8 45; 10-30 каса ад 5 г. — Лепшы гукавы фільм **АДНА**

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА Пач. а 7, 8 45, 10-30. Каса ад 5 г. — Замежны фільм Падарожжа Свэн-Гэдына па пустынях цэнтральнай Азіі. Звыш праграмы Урач паседж. Сесіі Акадэміі Навук

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Адкрыта з 12 дня — Мастацкі фільм **БАРЫСЛАЎ СЬМЯЕЦЦА** (І. Франко)

КІНО ПРАЛЕТАРЫ Пачатак а 7 гадз — **На тым баку** Хроніка № 55

6 лістапада г. г. роўна а 7 гадз. увеч. у памяшканьні кіно „Культура" АДБУДЗЕЦЦА

ўрачыстае, прысьвечанае XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі,

паседжаньне пленуму Менскага Гарадзкога Савету

сумесна з ЦК КП(б), ЦКК КП(б), ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, ЦСПСБ Гаркому КП(б), Гар. КК КП(б), Гар. КСМБ, Гарпрафсавету пры ўдзеле прадстаўнікоў Чырвонай армії і працоўных прадпрыемстваў гораду Менску.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. XIV год сацыялістычнага будаўніцтва.
2. Мастацкая частка.

Уваход у памяшканьне: члены і кандыдаты гарсавету, члены ЦК КП(б) ЦКК КП(б), ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, ЦСПСБ. Гаркому КП(б) Гар. КК КП(б). Гар. КСМБ і Гарпрафсавету—прахозяць па сваіх мандатах працоўных прадпрыемстваў і прадстаўнікі Чырвонай армії—па запрашальных білетах, распаўсюджаных праз Гарпрафсавет і нач. гарнізону.

МЕНГАРСАВЕТ

Таварыства садзейнасьці рацыяналізацыі вучоту (ОРУ)

АРГАНІЗУЕ

5-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы рахункаводаў для Кіраўніцтва луггасамі

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй 50 р. у м-ц. Кватэрамі не забясьпечваюцца.

Пасьля скончэньня курсаў абавязаны працаваць 2 гады на раёне ў сыстэме к-ва луггасам.

Да заяў даваць наступныя дакументы: аб асьвеце (ня ніжэй 5 груп) аб сацыяльным становішчы, аб узросьце (ня менш 17 год) аб праве голасу, а калгасьнікі згоду свайго праўленьня.

Адрас: Менск, Таварыству садзейнасьці рацыяналізацыі вучоту (ОРУ), Савецкая 55, уваход з варот.

Прыём заяў да 15-га лістапада

БЕЛПТУШКА-ТРЭСТУ САГАДОЎЧАМУ ТРЭСТУ

ПАТРЭБНЫ НАСТУПНЫЯ СПЭЦЫЯЛІСТЫ:

1. Спэц па сухапутнай птушцы.
2. Спэц па воднай птушцы
3. Спэц па трусох.
4. Інжынэр будаўнік.
5. Тэхнік будаўнік.
6. Фінанс ст-плянавік.
7. Аграном-плянавік.

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

Зварочвацца Менск, Савецкая, 70 3-ці паверх, да дырэкцыі.

З 1-га студзеня 1932 году

ПРЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІМ ПАЛІТЫКА-АСЬВЕТНЫМ ТЭХНІКУМЕ (МАГІЛЕЎ, КАМСАМОЛЬСКАЯ, 28)

АДЧЫНЯЮЦЦА

ТРОХМЕСЯЧНЫЯ ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

для ВЯСНОВАГА НАБОРУ ў гэты ТЭХНІКУМ

На курсы каманд ыруюць райкомы КП(б)Б, КСМ і райвыканкомы з кожнага раёну ня менш трох асоб. Прымаюцца партыйны, камсамольцы і 10 проц. беспартыйных з адукацыяй ня ніжэй чатыры-пяць груп сямігодкі, узрост ад 17—35 год з стажам партыйнай, камсамольскай, або грамадзкай працы ня менш 2-х гадоў.

На курсах будуць існаваць беларускі, польскі і ідышскі сэктары

Прыём заяў з дакумантамі (камандыроўка, даведкі, аб сацыяльна-маемасным становішчы узросьце, заняцьці, адносінах да вайсковай службы і заведзеная анкета) адбываецца да 15 га сьнежня 1931 г.

Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй у разьмерах 30 руб. Пасьцельныя прылады павінны мець свае.

Дырэктар тэхнікуму КАПАЕВ Ч.

ПОЛАЦКІМ ЦАГЕЛЬНЫМ ЗАВОДАМ ПАТРЭБЕН галоўны БУХГАЛТАР

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

Прадастаўляюцца камунальныя ўслугі

Жадаючых просім зьвяцца асабіста альбо накіраваць заяву.

Завадакіраўніцтва

Сёньня 5 XI г. г. а 6-й гадзіне увечары ў памяшканьні 25-й школы (Савецкая, 44)

АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ

Прэзыдыуму ЦП Саюзу Белпрацасьветы са зьлётам асьветнікаў-ударнікаў і прафактыву.

На абмеркаваньне дню: Даклады-рапорты НК Асьветы, Белкаапсаюзу, Наркамснабу, Белкалгасцэнтру, Менскага і Гомельскага гаркомаў Саюзу, Барысаўскага, Койданаўскага, Чэрвеньскага і Слуцкага райкомаў Саюзу і менскіх гарокомаў і МК аб ходзе выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.

Пад аказаньнем старшынь менскіх ГК і МК саюзу шырока апавясьціць аб гэтым [illegible] і прафактыў і забясьпечыць яўку апошніх.

Старшыня [illegible] ЦП саюзу РЫЗВАНОВІЧ.

ВІЦЕБСКАМУ Камунальнаму Трэсту ПАТРАБУЕЦЦА ТЭХНІК-КАРМОЎШЧЫК

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

ЗГУБЛЕНЫ:

Паявая кніжка, выданая Мсьціслаўскім спажыв. т-вам, вайсковая кніжка, пашпарт, і даведка аб выбарчых правох Булыгінай, А. кв. 1088-п.

Паявая кніжка Новіка І. № 650, выданая Азарыцкім райсаюзам К. кв. 1094-п

Талон за № 2022 на суму 23 р. 36 к. на вывазку дроў, выд. Ламавіцкім лесгасам на імя Шынкарэнка С. П. К. кв. 1095 п.

Вайсковы білет Гуркова А. П., выд. Дрыбінскім вайсковым сталом, паявая кніжка, выданая Дрыбінскім Спажыў-т-вам Кв. 1100-п.

Сяброўскі білет саюзу працасьветы Фішмана Б. І., выд. Ельскім РВК саюзу. Кв. 1103 п.

Сяброўскі білет Васілеўскага П. В. за № 1988, выданы Магілеўскім акруговым аддзяленьнем саюзу працасьветы. Кв. 1097 п.

Пасьведчаньне Жураўля Р. А. аб скончэньні Капаткевіцкай 7-х годк. Кв. 1098 п.

Пячатка к гасу «Новы араты» зной дзена лічыць сапраўднай. К. кв. 1099 п.

Вайсковы білет Мармура М. Л., выданы Копыльскім райваенкаматам. Кв. 1096 п.

Студэнцкі білет Хруцкаюся А. Г., выд. Горацкім Кв. 1107 п.

Паявая кніжка Цурко П., выданая Азарыцкім РВК кв. 1093-п.

Конская вучотная картка Цурко П., выданая Азарыцкім РВК кв. 1089-п.

Нарсуд Чэрвеньскага раёну за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Віхоцкаму А. А.

Народны суд Нараўлянскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне грам. в. Мухаеды Касьцюченка Я. А. старшыні сельсавету і Музычэнку В. Т., сакратару сельсавету за наладжваньне п'янак у сельсавеце.

Народны суд Нараўлянскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні калгасу «Завет Леніна» Майсейчыку І. В. за скарыстаньне памольнага збору без нараду Саюзхлебу.

Народны суд Нараўлянскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Мельніку Д. Э. і Булаву К. за халатнасьць пры праведзеньні бульбазагатовак.

Народны суд Нараўлянскага раёну абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Шыкуку С. Я. за несвячасовае выкананьне выканаўчага аркушу па справе Ядчэнка.

Вайсковы білет Хмелеўскага І., выд. Пятрыкоўскім ВРК у 1930 г. нарадж. 1909 г. квт. 682-п.

Партбілет № 0814415 т. Барысаў, вайсковы білет, асабовае пасьведчаньне, справка аб сац. становішчы на імя Кэрпа Я. А., квт. 655-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Т